ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафрук")
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕ
За радок мопр. пасля тэкс
Іншагародніх абвестак—1 р.
Пасярод тэксту—у два разы дар
Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. садатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 2-81
„ абвестак . . 7-81

АУТОРАК, 2 верасьня 1930 г.
№ 205 (3803)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Урад бізуна „ўціхамірвае" Зах. Беларусь

Тэлеграфны провад прынёс вестку аб новай страшэннай правакацыі польскага фашызму ў адносінах да рабочых і працоўных сялян Заходняй Беларусі.

Кінуты ў засьценкі дэфэнзывы беларускія рабоча-сялянскія дэпутаты.

Этапэ гэраічнага рэвалюцыйнага змаганьня ў фашысцкай Польшчы, вызваленчае барацьбы ў Заходняй Беларусі запоўнена старонкамі турмаў, катаваньняў і прасьледваньняў рэвалюцыйных дзеячоў і рабоча-сялянскіх арганізацый. Асабліва памятна працоўным Савецкай Беларусі расправа польскага фашызму над Беларускай Сялянска-Рабочай Грамадой, над яе рэвалюцыйнымі дзеячамі. Са дня ў дзень прыбываюць да нас усё новыя весткі аб новых расправах, аб новых сотнях арыштаваных, аб новых ахвярах, замардаваных у фашысцкіх «фабрыках сьмерці».

Груба, пасьпех, нават не стараючыся захаваць мнімасьць фашысцкай «законнасьці», кінуты ў турмы беларускія рабоча-сялянскія дэпутаты. Цкаваньне беларускага рабоча-сялянскага клюбу вялося са дня ў дзень платнымі фашысцкімі пісакамі. Выдумляліся розныя байкі аб сувязі іх з «Менскам», вядомыя, набіўшыя аскому байкі аб «савецкіх чырвонцах» і г. д. Два дні таму назад віленскае фашысцкае «Слова» пабіла рэкорд у гэтым напрамку, зьмясьціўшы паведамленьне аб тым, што менскія газэты заклікаюць насельніцтва Зах. Беларусі галасаваць за сьпіс рабоча-сялянскага соймавага клюбу. Што можа быць больш сьмешнага?

Беларускія рабоча-сялянскія дэпутаты за апошні час шмат разоў зьбіваліся пераапранутымі паліцэйскімі. Зьмыкі акрываўленых дэпутатаў сталі сьцягам рэвалюцыйных рабочых і сялян пры апошніх выбарах у Лідзкім і Сьвяцянскім паветах.

Ва ўчарайшых нумарох віленскіх фашысцкіх газэт, без розьніцы іх напрамку, зьявілася сфабрыкаваная дэфэнзыкай заметка, нават з адпаведным загалоўкам, «Беларускі рабоча-сялянскі клюб на службе ў камуністых». Там гаворыцца аб тым, што паліцыя арыштавала нейкага, нібыта, супрацоўніка дэпутата Вальпца, у якога быццам знойдзена камуністычная літаратура. Больш ніякіх фактаў у заметцы не трапляецца. Толькі зараз у дэфэнзыве ўдарным парадкам фабрыкуюцца шляхам шпікаўскіх фальшывак «довады» «вінаватасьці» беларускіх рэвалюцыйных дэпутатаў.

Гэтыя арышты не зьяўляюцца выпадковым крокам з боку польскага ўраду—гэта зьвяно цэлага ланцугу ў палітыцы польскага фашызму ў Заходняй Беларусі.

Фашысцкая Польшча знаходзіцца зараз у тупіку і разьядаецца вострым крызісам. Кіруючыя клясы Польшчы адчуваюць, што яны жывуць па вулкане з кіпучай лавай рэвалюцыйнага руху мас у яго нетрах, гатовай нізрынуць існуючы ў Польшчы капіталістычны лад. У гэты крытычны для польскага фашызму момант ён кінуў на стол свае апошнія адцьвіўшыя «козыры». На чале ўлады «камэндант». Пасьля некаторага часу «выратоўваньня» Польшчы польскім фашысцкім лягерам, Пілсудзкі выходзіць з цені, афіцыйна садзіцца ў прэм'ерскае крэсла, каб «выратаваць» Польшчу. Плян яго салдафоцкі просты. Прыкрыкнуць, тупнуць нагой на сямейную апазыцыю. Заліць крывёю, задушыць унтерскім ботам рэвалюцыйны рух рабочых і сялян «ўціхамірыць» палаючыя «крэсы».

Арышты беларускіх рабоча-сялянскіх дэпутатаў, новыя вакханаліі тэрору ў Зах. Беларусі—зьяўляюцца часткай усяго пляну «ўціхамірваньня».

Яны зьяўляюцца адказам на рэвалюцыйны ўздым, на ўздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, на правал беларускіх нацыянал-фашыстых.

А апошнія падзеі з усёй выразнасьцю паказалі банкруцтва беларускіх нацыянал-фашыстых. Выбары, якія адбыліся ў некаторых паветах Заходняй Беларусі, прынесьлі вялізарныя перамогі рэвалюцыйнаму лягеру Заходняй Беларусі і катастрафічныя паражэньні беларускім нацыянал-фашыстым з-пад усіх сьцягаў і шырмаў.

Між іншым, жаданьнем узьняцьця аўтарытэту беларускіх нацыянал-фашысцкіх груп трэба тлумачыць і тое, што разам з рабоча-сялянскімі дэпутатамі арыштаваны і згоднік, нацыянал-фашысты—Рагуля. Фашызм хоча ашукаць рабоча-сялянскія масы, якія рэвалюцыянізуюцца, інспэніроўкай «прасьледваньня» ў адносінах да аднаго з нацыянал-фашыстых, стварэньнем вакол яго ілжывае аўрэолі. Дарэмна! Працоўныя масы ведаюць, што сутычкі паміж розным фашысцкімі групамі зьяўляюцца сямейнай спрэчкай унутры фашысцкага лягеру.

Невыпадковым выяўляецца і тое, што беларуская рабоча-сялянская фракцыя кінута ў турмы якраз з прыходам да ўлады натхніцеля «паходу на Кіеў». Гэтыя арышты зьяўляюцца арганічнай часткай падрыхтоўкі Польшчы да вайны з Савецкім Саюзам. «Ўціхамірваньне» «крэсаў» мае на мэце ў першую чаргу падрыхтаваць плянцдарм для будучай антысавецкай вайны, для нападу на БССР і СССР.

У гэтай падрыхтоўцы да вайны з Савецкім Саюзам прымае актыўны ўдзел беларуская контр-рэвалюцыя на тым і другім баку мяжы. Беларускія нацыянал-фашыстыя ў сваёй газэце адкрыта заклікаюць да вайны з Савецкім Саюзам. Нядаўна газэта «Наперад» у адным з сваіх артыкулаў пісала:

«... На ўсходніх рубяжох сучаснае Польшчы вялізарная большасьць насельніцтва ня польская. **Дык і ўся справа абароны гэтых границ прымае выразна і прынцыпова палітычны характар.** Тое, што робіцца за чырвоным кардонам, — піша газэта, — дае яшчэ раз—можа ўжо апошні—нячувана **памысныя магчымасьці для польскай палітыкі...** Ці выкарыстоюць гэтую нячувана карысную, як кажуць, канъюнктуру, кіраўнікі сучаснай Польшчы, дзеля **сьцярэжэньня асноўнай задачы польскай усходняй палітыкі** — поўнага паразуменьня з сваімі тэрытарыяльнымі меншасьцямі, гэта — ня толькі справа іх дзяржаўнага розуму, але можа быць і пытаньне ўсёй будучыні Польшчы, як незалежнай дзяржавы...».

Беларускія нацыянал-фашыстыя, як відаць з гэтак цытаты, адкрыта і актыўна заклікаюць польскі фашызм да выраўнаньня ўсходняй «праблемы» ўзброенай інтэрвэнцыі, да захопу Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны. Беларускія нацыянал-фашыстыя заяўляюць, што наміж імі і польскім фашызмам няма ніякіх розпагалосьсяў у справе падрыхтоўкі вайны з Савецкім Саюзам. **Беларускія нацыянал-фашыстыя зьяўляюцца непасрэднымі ўдзельнікамі ў распраўках над беларускім нацыякальне-вызваленчым рухам, бліжэйшымі дапаможнікамі польскага фашызму.**

Капвульсыўнымі схваткамі тэрору польскі фашызм хоча вырвацца з пяскоў крызісу, затрымаць гадзіны сваёй пагібелі, затрымаць і павярнуць назад кола гісторыі. Але гэта нехагчыма. Сізыфавая праца. Ніякія сілы ня здолеюць задушыць усё ўзрастаючы нацыянальна-вызваленчы рух працоўных мас Заходняй Беларусі супроць белапольскіх акупантаў і іх беларускіх нацыянал-фашыстаўскіх дапаможнікаў.

Нячуваны разгул фашысцкага тэрору ў Заходняй Беларусі

Беларускія рабоча-сялянскія дэпутаты кінуты ў засьценкі дэфэнзывы

ВАРШАВА, 31. ПАЛІТЫЧНАЯ ПАЛІЦЫЯ АРЫШТАВАЛА ЎСІХ БЕЛАРУСКІХ ДЭПУТАТАЎ, ЯКІЯ УВАХОДЗЯЦЬ У СКЛАД ЛЕВАГА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА БЛЕКУ. АРЫШТАВАНЫ ГАЎРЫЛІК, КРЫНЧЫК, ВАЛЫНЕЦ. ЧАЦЬВЕРТЫ ДЭПУТАТ ЛВАРЧАНІН УЖО ДАЎНО ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ТУРМЕ. АРЫШТАВАНЫ ТАКСАМА БЕЛАРУСКІ ДЭПУТАТ РАГУЛЯ, ЯКІ ЎВАХОДЗІЦЬ Ў СКЛАД ЗГОДНІЦКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГРУПЫ ЯРЭМІЧА.

ПАЛІТЫЧНАЯ ПАЛІЦЫЯ ЗРАБІЛА Ў ВАРШАВЕ РАД НОВЫХ ВОБЫСКАЎ І АРЫШТАЎ. АРЫШТАВАНА 20 ЧАЛАВЕК НА АББІНАВАЧВАНЬНІ Ў ПРЫНАЛЕЖНАСЬЦІ ДА КАМПАРТЫІ.

Фашысцкі тэрор у Заходняй Украіне

ВАРШАВА, 1. У Львоўскім ваяводзтве палітычная паліцыя зрабіла масавыя арышты сярод украінцаў, якія падазраюцца ў належнасьці да украінскай ваеннай арганізацыі. Паводле паведамленьняў газэт, арышты ў Заходняй Украіне пранягваюцца. У радзе маёнткаў зноў пачаліся пажары.

ВЫБАРЫ ПАД ДУБІНКАЙ І РЭВАЛЬВЭРАМ

ВАРШАВА, 31. Апазыцыйныя газэты, камэнтуючы роспуск сойму, лічаць, што **ўрад пойдзе на выключныя злоўжываньні пры выбарах.** У палітычных колах няма упэўненасьці ў тым, што да самага моманту выбараў ня будзе дэфэтавана зьмена выбарчага закону. Орган польскіх кансэрватараў «Дзень польскі» павёў ужо кампанію ў гэтым напрамку.

Асеньняя сяўба

СЫГНАЛ ФАКТАЎ

ФАСФАРЫТНЫЯ ЗАВОДЫ НЯ ВЫКОНВАЮЦЬ ПРАМФІНПЛЯНУ

Плян кантрактацыі азімых па БССР выканан толькі на **2%**

Калгасы і саўгасы забясьпечаны ўгнаеньнем усяго на **17%**

Трактарная калёна вышла ў поле

ТОРФ, ВАПНУ, ПОПЕЛ—ПАЛЯМ

ЗАВАПНАВАНА **13.000 га** (30 проц. ПЛЯНУ)

ЗАВОЗ УГНАЕНЬНЯЎ ЗРЫВАЕЦЦА

Асеньняя сяўба і кантрактацыя азімых культур стаіць **ПАД ПАГРОЗАЙ З-ЗА НЕДАХВАТУ ЎГНАЕНЬНЯ.** Кожны дзень з месц паступаюць трывожныя весткі, што сяўба тармозіцца, што кантрактацыя зрываецца таму, што няма штучнага угнаеньня. Сеньненскі райкалгасасаюз, напрыклад, тэлеграфуе ў Менск літаральна наступнае: «Фарсуйце адгрузку фасфарытнай мукі, пачынаецца сяўба, тармозіцца кантрактацыя». Аналягічныя тэлеграмы дзесяткамі паступаюць і ад іншых раёнаў.

Суперфасфат зьяўляецца асноўным угнаеньнем. Яшчэ ўвесну для БССР было вызначана на асеньнюю сяўбу 15.500 тон суперфасфату. Але гэта лічба некалькі раз зьмяцялася ў бок скарачэньня. Нарэшце, пасьля шматлікіх хадайніцтваў, удалося адваяваць гэтую колькасьць, але з правам выкарыстаць у бягучую асеньнюю сяўбу толькі 3.500 тон суперфасфату. Зусім зразумела, што гэта надзвычай **МАЛА.** Суперфасфату на хопіць. Недахват суперфасфату можа быць ліквідаваны іншымі ўгнаеньнямі: фасфарытнай мукой, сільвінітам, каліянай сольлю, каспіцкай мукой і інш.

Беларускія арганізацыі не паклапаціліся, каб забясьпечыць асеньнюю сяўбу гэтымі ўгнаеньнямі. Завоз фасфарытнай мукі, напрыклад, **ЗРЫВАЕЦЦА,** ня гледзячы на тое, што яна вырабляецца на заводах БССР. На месцы павінна быць завезена 17.000 тон фасфарытнай мукі. Але на 15-га жніўня фасфарытныя заводы адгрузілі толькі 4.250 тон (**25 ПРОЦ.** пляну). За трэцюю дэкаду становішча амаль не зьмянілася.

Белхімаб'яднаньне **НІЧОГА** ня робіць, каб фарсаваць вытворства фасфарытнай мукі. Фасфарытныя заводы працуюць рабскімі тэмпамі, правальваюць свае прамфінпляны, ставячы пад пагрозу асеньнюю сяўбу.

Яшчэ горш стаіць справа з завозам каспіцкае мукі. На 15-га жніўня на месцы завезена толькі 770 тон каспіцкае мукі (**16 ПРОЦ.** пляну). БССР адмоўлена ў завозе сільвініту. Белсельгасснаб атрымаў паведамленьне, што сільвініт ня будзе адгружацца ў БССР да вясны будучага году. Між тым меркавалася атрымаць гэтага ўгнаеньня для калгасаў і саўгасаў Беларусі 2.000 тон.

З вызначаных для Беларусі 4.000 тон каліянай солі, дагэтуль не завезена ні аднэй тоны. Такім чынам, сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі БССР на сёньня мае толькі 8.520 тон розных угнаеньняў, замест 43.500 тон, прадугледжаных плянам. Інакш кажучы, плян завозу ўгнаеньняў для асеньняй пасеўнай кампаніі выканан толькі на **17,2 ПРОЦ.**

У сьвятле гэтых фактаў злачынныя зьяўляюцца адносіны некаторых раённых арганізацый да скарыстаньня ўгнаеньняў. З Гомеля нам паведамляюць, што на шмат якіх чыгуначных станцыях **ЛЯЖАЦЬ** пад адкрытым небам дзесяткі тон розных каштоўных угнаеньняў. За такія зьявішчы вінаватых трэба прыцягваць да самай суровай адказнасьці.

Як ідзе мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў угнаеньня? **ДРЭННА, ЗУСІМ ДРЭННА.** Як праводзіцца такія важнейшыя мерапрыемствы, як рацыянальнае скарыстаньне гною, капчаваньне глебы, збор попелу і г. д.?

Аб зборы попелу мясцовыя арганізацыі наогул забыліся. На працягу апошніх 5-6 месяцаў попел нідзе не зьбіраецца. У жактах, на заводах і фабрыках марна гінуць сотні тон попелу. Белкалгасасаюз, Белсельтрэст і інш. арганізацыі на гэта не рэагуюць і ня ўжываюць ніякіх захадаў да збору попелу.

Ваганьне глебы знаходзіцца ў пагражаючым становішчы. На месцох ёсьць вялікая колькасьць ванны, адна: раённыя арганізацыі іх не выкарыстоўваюць. У вёсцы Брадзец ляжыць 2.125 тон ванны, у раёнах 6. Віцебскай акругі — 5.265 тон, у Дрысенскім раёне — 128 вагонаў ванны і г. д. Агульны плян капчаваньня выканан толькі на **36 ПРОЦ.** Замест 32.100 га заваппавана толькі 13.000 га.

Далей марудзіць нельга. **32.100 ГЭКТ. ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАВАПНАВАНЫ.** Попел — палям калгасаў і саўгасаў. Ваппаваньню, тарфаваньне і збор попелу на бацьцы тэмпы.

У ТЭРМІН

ЗАСЫПАЦЬ НАСЕННЫЯ ФОНДЫ

Тэлеграма Белкалгасцэнтру усім калгасным, каапэрацыйным саюзам і калгасным сэкцыям

ІНФАРМАЦЫЯ З РАЁНАЎ СЫГНАЛІЗУЕ АБ МАГЧЫМЫХ ЗРЫВАХ СТВАРЭНЬНЯ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ.

КАТЭГАРЫЧНА, ПАД АСАБІСТУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ СТАРШЫНЬ САЮЗАЎ, ПРАПАНУЕМ ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ, ЯКІ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ СВАЯЧАСОВАЕ І ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ.

ЗАРАЗ-ЖА АРГАНІЗУЙЦЕ ДАПАМОГУ КАЛГАСАМ, ЯКІЯ АДСТАЮЦЬ.

АБАВЯЗКОВА КОЖНУЮ ДЭКАДУ ПРАВЯРАЙЦЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ СТВАРЭНЬНЯ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ.

ІНФАРМУЙЦЕ КАЛГАСЦЭНТР ДЭКАДНЫМІ ЗВОДКАМІ АБ ВЫКАНАНЬНІ ГЭТАЙ ДЫРЭКТЫВЫ.

С. МІЦЬКОЎ.

ЁСЬЦЬ 12 БУДЗЕ 128

РАГАЧОЎ, 1. (Наш спэц. кар.). Сяўба ў Рагачоўскім раёне пачынае разгортвацца. 28-га жніўня камуна „МАЛАДЯ ГВАРДЫЯ" выйшла на сяўбу. На п'е выехала 75 камунараў, якія засеялі 12 гэкт. Сяўба працягнецца 12 дзён. Будзе засеяна 128 га.

БІТУС.

ЗЛАЧЫННАЯ СЬПЯЧКА

САЎГАСЫ АРШАНСКАГА РАЁНУ ПРАВАЛІЛІ УБОРКУ, НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА СЯЎБЫ

ВОРША, 1. (Наш спэц. кар.). Саўгасы Аршанскага раёну ганебна **праваліі** ўборачную кампанію. У большасьці калгасаў уборка далёка ня скончана. У паасобных мясцох ураджай гніе на полі і яго ніхто ня ўбірае. У саўгасе **Высокае** да сёнешняга дня стаяць у снапох на полі тры га жыта і **10** га пшаніцы. І жыта і пшаніца пачалі гніць і зарастаць зеляніной. Да гэтага часу саўгас не скасіў **120** гэкт. сенажаці. На палёх саўгасу псуецца **39** га ня ўбранага аўсу.

Такое-ж становішча заўважаецца і ў саўгасе **Межава,** дзе пасавалася **16** га пасеваў жыта. Тут таксама загінула 10 га канюшыны. Да асеньняй сяўбы саўгасы Аршанскага раёну зусім **не падрыхтаваны.** Яны павінны былі ўжо задаволіць калгасы і адзінаасобнікаў пасеўным матар'ялам. Між тым, саўгасы ня толькі не прыступілі да абмалоту, але нават ня здолелі скончыць уборку і часткова пасавалі свой ураджай. Белсельтрэст не рэагуе на гэта выключна трывожнае становішча.

Наогул, варта адзначыць, што ў раёне падрыхтоўка да асеньняй сяўбы ня была праведзена. Да гэтага часу не прыведзены ў парадак машыны па ачыстцы насеньня. У Высоцкім сельсавеце, напрыклад, нават ня ведаюць, дзе знаходзіцца машына па ачыстцы насеньня. У 4-х саўгасах раёну яшчэ не падрыхтавана плошча пад азімы клін. Патрэбны самыя рашучыя меры.

Ганьба, а не работа

„На 10 жніўня кантрактацыя не праводзіцца..."
„На 1 верасьня ў ходзе кантрактацыі ніякіх зьмен..."

Кантрактацыя азімых культур у СССР стаіць на парозе поўнага ПРАВАЛУ. Тэрмін кантрактацыі СКОНЧЫЎСЯ 1 верасьня, аднак, практычная работа яшчэ амаль зусім НЕ РАЗГОРНУТА. Мы прымушаны апэраваць зводкай аб ходзе кантрактацыі на 20-га жніўня. Больш позьніх вестак няма. Беспаляводсаюз не наладзіў сувязі са сваёй сыстэмай. Райпаляводсаюзы і Райкалгасасаюзы дасылаюць весткі аб ходзе кантрактацыі вельмі неакуратна і несвячасова.

На 20 жніўня плян кантрактацыі выкананы ўсяго на 2 ПРОЦ. Калгасы заканктравалі 7.180 гэкт. замест 120.000 гэкт., вызначаных плянам. Плян кантрактацыі па калгасах выкананы на 6 ПРОЦ. Па індывідуальным — плян кантрактацыі выкананы ўсяго на 0,6 проц. Замест 400 гэкт. заканктравана толькі 2.488. Лічбы гавораць самі за сябе. Шмат якія мясцовыя арганізацыі бязьдзейнічаюць. Вось некаталі ўзораў бюракратычных адпісак раённых органаў замест практычнай работы.

КАРАЛІНСКІ райкалгасасаюз паведамляе Беспаляводсаюзу, што «кантрактацыя азімых збожжавых культур на 10 жніўня г. г. у раёне яшчэ не праводзіцца».

Пры гэтым сваё паведамленьне каралінскі райкалгасасаюз даслаў толькі некалькі дзён назад.

Што-ж зроблена калгасасаюзам за гэты час. Роўна НІЧОГА. У зводцы на 1 верасьня райкалгасасаюз піша:

«Паведамляем, што зьмен у кантрактацыі паляводчых культур на 1 верасьня г. г. ня было».

Калі-ж, нарэшце, райкалгасасаюз мяркуе заняцца кантрактацыяй? Гэта застаецца сакрэтам. Ясна толькі адно: Каралінскі райкалгасасаюз злачынна ігнарыруе кантрактацыю.

Вушацкі райкалгасасаюз бяз усякіх камэнтараў паведамляе: «На 20 жніўня заканктраваных азімых няма».

А што робіць вушацкі райкалгасасаюз па кантрактацыі? Відаць тое самае, што і каралінскі райкалгасасаюз.

Рэкорд бюракратычнай бязьдзейнасьці пабіў бягомльскі райпаляводсаюз. Вось яго «апэрацыйная зводка»:

«Гэтым паведамляецца, што ў Бягомльскім раёне толькі з 5 жніўня пачалася ўборачная кампанія, якая працягнецца да 1 верасьня, а толькі 31 верасьня распачнецца сяўба азімых культур, а таксама кантрактацыя. Таму ніякіх вестак аб ходзе кантрактацыі азімых культур да 5 верасьня ня можа быць даслана. Старшыня райпаляводсаюзу (подпіс)».

Аказваецца, для Бягомльскага райпаляводсаюзу тэрміны ня існуюць. Тое, што кантрактацыя да 1 верасьня павінна ўжо быць скончана, для яго ня мае значэньня. Ён спакойна мяркуе распачаць кантрактацыю толькі 5 верасьня.

На 20 жніўня кантрактацыя ня была распачата па Грэскім, Горацкім, Вузьдзенскім, Камарынскім, Мар'іна-Горскім і інш. раёнах.

Да судовай адказнасьці вінаватых у зрыве кантрактацыі.

С. Г—н.

У БОЙ ЗА СІЛАС

НІ АДНЭЙ ТОНЫ МЕНШ

1.000.000 тон сіласу—да 1 кастрычніка

Сілас павінен быць

ПАСТАНОВА БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ АБ ХОДЗЕ СІЛАСАВАНЬНЯ Ў КАЛГАСАХ

Адзначыць, што як праўленьні калгасаў, так і раённыя калгасныя і каапэрацыйныя саюзы недаацэньваюць значэньня сіласаваньня кармоў. З прычыны гэтага яны не арганізавалі мас калгаснікаў на выкананьне заданьняў па сіласаваньні, з-за чаго гэтае важнейшае мерапрыемства па стварэньні кармавой базы **ЗРЫВАЕЦЦА.**

Разглядаючы зрыў і невыкананьне заданьняў па сіласаваньні, **як злачынства, накіраванае на зрыў разьвіцьця жывёлагадоўлі,** праўленьне Калгасцэнтру **прапануе:**

1. Райкалгасасаюзам, калгасным сэкцыям і каапсаюзам на працягу 2-х дзён праверыць работу па сіласаваньні ва ўсіх калгасах, арганізаваўшы на месцы працу па падрыхтоўцы ям, траншэй і закладцы сіласнай масы.

2. На працягу трох дзён правесьці ва ўсіх калгасах сходы калгаснікаў, растлумачыўшы калгаснікам карысьць сіласаваньня і необходнасьць поўнага выкананьня заданьняў. Вылучыць у кожным калгасе аднаго з членаў праўленьня, адказнага за ход сіласаваньня. Вылучыць спэцыяльныя брыгады калгаснікаў па сіласаваньні.

3. Белкалгасцэнтр зварачаецца да ўсіх калгаснікаў з заклікам пабальшавіцку, пабаявому, шляхам разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва арганізаваць работу па выкананьні плянаў па сіласаваньні, памятуючы, што выкананьне плянаў сіласаваньня дасьць магчымасьць хутка разгортваць найбольш прыбытковую галіну гаспадаркі—жывёлагадоўлю.

4. За пядбайныя адносіны да выкананьня плянаў па сіласаваньні абвясьціць суровую вымову старшыням **Брагінскага, Клічаўскага, Камарынскага** райкалгасасаюзаў і праўленьням калгасаў: **«Вольная Праца»,** Церахоўскага раёну, **«Савецкая Беларусь»** Сьмілавіцкага раёну, **Фрайншафт»** Віцебскага раёну.

5. Прапанаваць праўленьням пералічаных саюзаў і праўленьням калгасаў дабіцца пералому ў рабоце па сіласаваньні, поўнасьцю выканаўшы заданьні.

Абавязаць праўленьні пералічаных саюзаў паведаміць тэлеграфам Калгасцэнтру да 5-га верасьня, што практычна зроблена ў выкананьне гэтае дырэктывы.

Напярэдзіць старшынь праўленьняў гэтых саюзаў, што калі ня будзе зруху ў сіласаваньні да 5-га верасьня—**праўленьні саюзаў будуць распушчаны.**

5. Папярэдзіць усіх работнікаў калгаснай сыстэмы, што **за нядбайныя і няўважлівыя адносіны да выканаьня плянаў па сіласаваньні вінаватыя будуць зьнімацца з працы і прыцягвацца да адказнасьці.**

6. Абавязаць старшынь усіх раённых саюзаў тэлеграфам кожныя 5 дзён паведамляць Калгасцэнтр аб ходзе сіласаваньня. Непрадстаўленьне вестак будзе разглядацца, як адсутнасьць работы на мясцох і кожны асобны выпадак непрадстаўленьня вестак будзе абгаварвацца на праўленьні Калгасцэнтру.

7. Абавязаць усіх работнікаў Калгасцэнтру, камандыраваных на правядзеньне ўборачнай пасеўнай кампаніі ўзмацніць работу па сіласаваньні.

Забараніць зварот у Менск да поўнага выкананьня заданьняў па сіласаваньні.

8. **Уся работа па выкананьні пляну сіласаваньня павінна быць поўнасьцю выканана да 1-га кастрычніка.**

НАВУЧЭЦЬ ІХ ПРАЦАВАЦЬ

Сіласаваньне ў БЯЛЫНІЦКІМ раёне НЕ РАЗГОРНУТА. Большасьць калгасаў махнула рукой на гэту справу. Да 15 жніўня было выкапана 48 сіласных ям. Аднак, толькі выкапалі і на гэтым паставілі кропку. У раёне ніхто ня ведае, як трэба абліцоўваць сіласныя ямы.

Б.

ПОЎНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ

РАСНА. (Наш кар.). Месячнік сіласаваньня ў Расьнянскім раёне ня даў ніякага пералому. Сіласаваньне паранейшаму ў раёне не праводзіцца. Райком партыі і райком камсамолу на сіласаваньне не зварачаюць ніякай увагі.

Г. С.

КАМСАМОЛ—ТВАРАМ ДА ТРАНСПАРТУ

МАСКВА, 1. ЦК УсеЛКСМ зьвяртае асаблівую ўвагу ўсяго камсамолу на тое, што ў радзе транспартных арганізацый ёсьць **адрыў кіраўніцтва ад мас транспартнай моладзі,** няўменьне арганізаваць вытворчы энтузіязм моладзі і г. д. У сувязі з гэтым, **ЦК УсеЛКСМ** прапануе арганізацыям УсеЛКСМ **праверыць работу транспартных ячэек камсамолу** і арганізаваць усю транспартную моладзь **на выкананьне прамфінпляну і вытворчых вымернікаў па асеньня-зімовых перавозках.**

ДА XVI МЮД-У—дня рашучага пратэсту і мабілізацыі пралетарскіх сіл

АДОЗВА ЦК УсеЛКСМ

МАСКВА, 1. **ЦК УсеЛКСМ** зьвярнуўся з адозвай **да ўсёй рабочай і працоўнай моладзі Савецкага Саюзу.**

Ва ўмовах абвостраных класавай барацьбы, уздыму новай рэвалюцыйнай хвалі, — гаворыцца ў адозве, — **выступіць пад бявымі сьцягамі працоўная моладзь усяго сьвету ў 16-ты МЮД.** Спакойна і упэўнена глядзіць Савецкі Саюз **на заўтрашні дзень. Трывогу б'е капіталістычны сьвет.** Сярод мюдаўскіх лёзунгаў самым яркім, самым баявым будзе лёзунг: **«Рукі прэч ад СССР, не дапусьцім нападу на Савецкі Саюз».**

МЮД заўсёды быў і застанецца рашучым пратэстам і днём мабілізацыі пралетарскіх сіл супроць імпэрыялістычнай вайны. Чым больш узмоцнена рыхтуюць вайну буржуазія і сацыял-фашыстыя, тым больш **незломная воля мільёнаў пралетараў і рабочай моладзі ў змаганьні, тым рэзэй будзе гарэць на камсамольскіх сьцягах лёзунг — «Вайну імпэрыялістычную ператварым у вайну грамадзянскую».**

У 16-ты МЮД маладыя пралетары Савецкага Саюзу зноў прадэманструюць сваю шчырую адданасьць генэральнай лініі партыі і яе цьвёрдаму правадніку — **ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б).**

Адбылася 7-я сэсія Цэнтральнага Савету Прафінтэрну

АБРАНА ВЫКАНБЮРО ПРАФІНТЭРНУ

МАСКВА, 31. Адбылася **7-ая** сэсія Цэнтральнага Савету Прафінтэрну. На парадку дня стаяла адно пытаньне — **выбары выканбюро і генэральнага сакратара Прафінтэрну. Генэральным сакратаром Прафінтэрну абраны тав. Лазоўскі.** У выканбюро абрана **26** чалавек, у тым ліку т. т. **Лазоўскі, Пятніцкі, Швэрнік, Аболін, Юзэфовіч, (СССР), Генкэр, Нідэркірхнер, Галінад (Нямеччына), Монмусо, Моэз (Францыя)** і прад стаўнікі **Польшчы, Чэха-Славакіі, ПАЗЦ, Італіі, Англіі Японіі, Лацінскай Амэрыкі** і інш.

БЭРЛІН—МАСКВА—УЛАДЗІВАСТОК

МАСКВА. Адчыненьне паветранай лініі **Бэрлін — Масква — Уладзівасток адбудзецца ў пачатку будучага году.** Уся вялізарная работа на пабудове Сібірскай паветранай магістралі ажыцьцёўлена Савецкім Саюзам **без замежнай дапамогі,** усяго ў два —два з паловаю гады.

І-АЯ МІЖНАРОДНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ

МАСКВА. 31 жніўня адкрылася **1 міжнародная канфэрэнцыя рабочай моладзі.** На канфэрэнцыі прысутнічае 75 дэлегатаў — удзельнікаў **V** кангрэсу Прафінтэрну і прадстаўнікі рабочай моладзі маскоўскіх прадпрыемстваў. Канфэрэнцыя заслухала даклад **т. Хітарава аб эканамічных баёх рабочай моладзі** і даклад т. Кірпаі **аб задачах прыхільнікаў Прафінтэрну ў рабоце сярод моладзі.** Канфэрэнцыю вітала дэлегацыя пралетарскай моладзі заводаў і фабрык Чырвонай Прэсьні.

РАСТЛУМАЧЭНЬНІ НАРКАМЗЕМУ І КАЛГАСЦЭНТРУ СССР

Наркамзем і Калгасцэнтр СССР растлумачае, што **прыкладны статут сельска-гаспадарчай арцелі не абмяжоўвае права членаў сельска-гаспадарчай арцелі вырошчваць маладняк, разводзіць, прыкупляць у адзіначасовае ўладаньне буйную і дробную рагатую жывёлу і сьвіней.** Праўленьні калгасаў абавязаны ўсяк садзейнічаць правільнаму догляду за жывёлай, якая прыналежыць калгаснікам.

За бальшавіцкія тэмпы ў хлебазагатоўках

Зараз можна ўжо з усёй упэўненасьцю канстатаваць, што адна з важнейшых дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб ваячасовай падрыхтоўцы да хлебазагатоўчай кампаніі—мясцовымі партарганізацыямі выкапана надзвычай нездавальняюча. Толькі дрэнная падрыхтоўчай работай можна вытлумачыць, што ў радзе важнейшых раёнаў мы яшчэ ня маем поўнага разгортваньня хлебазагатоўчай кампаніі. Многія таварышы забыліся, што справа ня толькі ў выкананьні гадовага пляну хлебазагатовак, але і ў тым, каб сваячасовае паступленьне збожжа ловага ўраджаю ў жніўні і першай палове верасьня забясьпечыла дзяржаве выраўнаньне яшчэ цэлага раду першачарговых задач (выкананьне прамфінпляну, будаўніцтва індустрыяльных гігантаў і г. д.). Мясцовыя, краевыя, абласныя і рэспубліканскія арганізацыі павінны былі, здавалася-б, ня выпускаць з-пад увагі паказанай акалічнасьці. Між тым, нават у лепшых раёнах, г. зн. у тых, якія ідуць упераадзе па хлебазагатоўках, за апошні пэрыяд паступленьне збожжа амаль стабілізавалася. Гэта гаворыць ужо ня толькі аб слабой рабоце партыйных і хлебазагатоўчых арганізацый у падрыхтоўчы пэрыяд, але і аб слабой рабоце ў пэрыяд самай кампаніі хлебазагатовак, і нават больш—аб адсутнасьці належнай настойлівасьці і правёрдасьці ў кіраўніцтве хлебазагатоўкамі. Адначасова мы сустракаемся зараз са зьявішчамі сьвядомага затрыманьня абмалоту, з імкненьнем часткі калгасаў як мага хутчэй разьмеркаваць вынікі ўраджаю, з рвацкімі тэндэнцыямі пры вызначэньні норм збожжа, якое павінна застацца. Усе гэтыя зьявішчы яўна антыкалгасныя, кулацкія. Але што-ж процінастаўлена з боку перадавой часткі калгасьнікаў, адзінаасобнікаў — беднякоў, лепшай перадавой часткі серадняцтва, а галоўнае—з боку партарганізацый паказаным вышэй антыкалгасным і кулацкім тэндэнцыям? Самаўпэўненасьць, разьлікі на самацёк, Лёзунг, кінуты партыяй: «калгасьнікі павінны ў першую чаргу здаць збожжа дзяржаве» — кепска надхоплены партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі. Між тым, ён павінен быць кіруючым і арганізуючым, баявым лёзунгам, на падставе якога трэба разгарнуць масавую работу і сацспаборніцтва. Нарэшце, ход хлебазагатовак характарызуецца таксама тым, што да гэтага часу ў радзе выпадкаў не даведзены да дваора цьвёрдыя заданьні для кулацка-заможнай верхавіны сяла, у іншых выпадках гэтыя заданьні хаця і даны, але выкананьне іх не кантралюецца. Барацьба са спэкуляцыяй, драцежнікамі, барацьба з кулацкім тэрорам праводзіцца слаба, прычым вакол усіх гэтых пытаньняў не мабілізавана грамадзкая думка калгасьнікаў і бяднякоў-серадняцкіх мас адзінаасобнікаў. Мясцовы друк не мабілізаваў сябе на барацьбу з усімі шкодлівымі рвацкімі, кулацкімі тэндэнцыямі, якія ёсьць у асобных калгасах і ў асобных сёлах сярод адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў. Усё гэта абавязвае паставіць цьвёрда ўсе гэтыя пытаньні перад мясцовымі партарганізацыямі. Нельга адлучыць ад хлебазагатовак пытаньне барацьбы за ўзмацненьне існуючых калгасаў і разьвіцьця далейшай калектывізацыі, правільная арганізацыя хлебазагатовак павінна прадстаўляць сабою адно са зьвеньняў ланцугу мерапрыемстваў па ўзмацненьні і разгортваньні калектывізацыі. Барацьба за выкананьне хлебазагатоўчага пляну павінна замацаваць у калгасьнікаў сьвядомасьць таго, што яны павінны быць актыўнымі змагарамі за сацыялістычную будоўлю, зьяўляючыся асноўнай апорай партыі на сяле. Ураджай гэтага году ня толькі здавальняючы, але і добры, але гэта яшчэ ня значыць, што партарганізацыі не павінны праводзіць вельмі сур'ёзнай, моцнай бальшавіцкай работы. Ураджай яшчэ ў большай ступені абавязвае калгасьнікаў і бяднякоў-серадняцкую частку індывідуальнікаў выканаць свае абавязацельствы перад дзяржавай. Масавапалітычная работа на хлебазагатоўках вельмі слаба разгорнута. А пярэдка адзначаецца проста неданупчальны апартунізм з боку асобных членаў партыі. Некаторыя апартуністыя могуць паставіць пытаньне: «гага, зноў націск, зноў будуць скажэньні, зноў будзе стрэлачнік вінаваты». Па скажэньнях партыйнай лініі і партыйных дырэктыў у любы бок партыя будзе біць самым бязьлітасным чынам. Перад абласнымі, краевымі, рэспубліканскімі і раённымі партарганізацыямі, перад усёй партыяй у цэлым стаіць задача—дабіцца неадкладнага і рашучага пералому у хлебазагатоўчай кампаніі, шляхам разгортваньня масавапалітычнай работы, шляхам мабілізацыі калгасьнікаў, бяднякоў-серадняцкай масы адзінаасобнікаў на сваячасовае выкананьне хлебазагатоўчага пляну. Неабходна разгарнуць гіганцкую работу сярод бяднякоў-батрацкай часткі калгасьнікаў супроць хвасьцізму, супроць рвацкіх антыкалгасных тэндэнцый сярод паасобных груп калгасьнікаў. Перадавыя калгасьнікі павінны дамагацца хутчэйшага абмалоту збожжа і неадкладнай здачы збожжа дзяржаве. Актыўнай работе клясавага ворага партарганізацыямі абсалютна невыстарчальна процістаўляецца арганізаваная маса перадавых калгасьнікаў, батрацкіх і бяднякоў-серадняцкіх мас адзінаасобнікаў. Тут шмат скэптычнасьці, саманадзейнасьці. І на іх трэба жорстка біць.

Характарызуючы работу на хлебазагатоўках, нельга гаварыць толькі аб партарганізацыях. Трэба з такой-жа рашучасьцю сказаць аб хлебазагатоўцах, якія ў падзеі, што за іх будуць працаваць, галоўным чынам, партыйныя і камсамольскія арганізацыі, ніякай работы з калгасьнікамі і індывідуальнікамі не вядуць і з хлебазагатоўцаў абярнуліся выключна ў прыёмшчыкаў збожжа. Гэта таксама свайго роду праяўленьне апартунізму, і яму трэба палажыць рашучы канец. Партыйныя арганізацыі павінны зараз-жа з усёй бальшавіцкай энэргіяй узяцца за справу хлебазагатовак. Гэта—першачарговая, важнейшая і ўсё вырашаючая праблема. Парт арганізацыі павінны ў бліжэйшы-ж пэрыяд часу дабіцца пералому ў справе хлебазагатовак і ўзяць бальшавіцкія тэмпы ў гэтай рабоце.

Постышаў.

У паход за ўсеагульнае навучаньне

БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ, ЯКАЯ МЯЖУЕ СА ЗЛАЧЫНСТВАМ

—Ва Ўраравіцкім раёне Гомельшчыны не пабудавана ні аднае школы.—У Менску замест пашырэньня жыльлёвая школьная плошча скарачаецца.—Каапэрацыйныя арганізацыі не забясьпечваюць школ і пікпунктаў сшыткамі і школьнымі прыладамі.

Трохмесячнік „за пісьменнасьць" павінен узьняць грамадзкасьць на сапраўднае вырашэньне задач усеагульнага навучаньня!

ПАШЫРЫЦЬ ШКОЛЬНУЮ ПЛОШЧУ!

ГРУБА ПАРУШАЕЦЦА ПАСТАНОВА ГАРСАВЕТУ

У бягучым навучальным годзе пытаньне аб пашырэньні школьнай плошчы стаіць надзвычай востра.

У сувязі з пастановай XIII зьезду КП(б)Б аб увядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня, па горадзе ў гэтым годзе неабходна пашырыць школьную плошчу, каб ахапіць дзяцей ад 8 да 15 год. Інакш дырэктыва партыі ня будзе выканана.

Ужо з 1 верасьня ў школах павінны пачацца заняткі. А між тым, цэлы рад школьных будынкаў па горадзе зараз не адрамантаваны. З рамонтам школьных будынкаў зараз справа стаіць зусім дрэнна.

Калі ў бліжэйшыя дні не зрабіць карэннага пералому ў гэтай справе, плян усеагульнага навучаньня па г. Менску будзе сарваны.

Акрамя гэтага, будзе нявыканана задача палітэхнізацыі школы, якую вызоўваюць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Палітэхнізацыя школы патрабуе арганізацыі пры школах адзаведных майстэрань, у якіх магчыма было-б праводзіць працоўныя працэсы. Пад майстэрні пры 12-ці гарадзкіх сямігодках, якія ў гэтым годзе рэарганізуюцца ў фабрычна-заводзкія сямігодкі (ФЗС), адводзяцца цёмныя і вільготныя сутарэньні, няпрыгодныя для работы.

Другая задача школы —арганізаваць грамадзкае харчаваньне.

Правільная пастаноўка харчаваньня зьвяцца зарукаю пасьпяховага выкананьня школьных плянаў і праграм.

Апрача гэтага, крывая стану здароўя нашых вучняў патрабуе безадкладнага пашырэньня школьнае плошчы.

У сувязі з пераходам школ на пяцідзёўку вучні маюць шмат вольнага часу, незанятага непасрэднай работай у школе.

З мэтай скарыстаньня вольнага часу, пры школах павінны быць клюбы. Карысьць такіх клюбаў пры школе ўсім вядома. Але ў цэлым радзе школ яшчэ і зараз клюбаў няма.

Такія факты гавораць аб нядбайных адносінах школьнае рады і іншых арганізацый да пастаноўкі выхаваньня ў школе.

Да рэчы — аб будаўніцтве школ.

У гэтым годзе на г. Менску пабудавана толькі адна школа на Ляхаўцы, мяркуецца пабудаваць адну школу на Серабранцы.

Назіраюцца моманты **грубага парушэньня пастановы гарсавету аб нескарачэньні школьных плошчаў. Гарсавет і органы НК на гэта не звярачаюць увагі.**

Трэба тэрмінова зрабіць пералом у справе пашырэньня школьных плошчаў, каб забясьпечыць поўнае камуністычнае выхаваньне дзетвары.

Ст. Губэр.

Ні адна школа не пабудавана

Уваравіцкаму РК КП(б)Б „няма часу займацца драбніцамі асьветы"

Паводле пляну, ва Ўраравіцкім раёне было вызначана пабудаваць 10 новых школ. На справе—**не пабудавана ні адна.** Рамонт школ ня скончаны. Ёсьць месцы, дзе летась школы былі забясьпечаны будынкамі, а цяпер і яны ня маюць памяшканьня (Рудня, Альхоўка, Ленінскі пасёлак, Чабашовіцкага сельсавету, і інш.).

Школы не забясьпечаны настаўнікамі. Для школ першай ступені не хапае больш 20 чал. настаўнікаў. У 2-х сямігодках няма ні аднаго настаўніка з вышэйшай асьветай.

Дзе плянавасьць у разьмеркаваньні сіл асьветнікаў? Яе няма.

У раёне ня ўзьнята грамадзкая думка вакол падрыхтоўкі да навучальнага году. **Партыйныя арганізацыі ў гэтых адносінах нічога ня робяць.** Калі на нарадзе, склікапай РК КП(б)Б па пытаньні аб усеагульным навучаньні, сакратар РК т. Попель абвінавачваў асьветнікаў у слабай падрыхтоўцы да навучальнага году — дык аб сабе ён сказаў: «няма часу займацца райкому драбніцам асьветы. Гэта справа настаўніцтва».

Скліканая раённая канфэрэнцыя настаўнікаў амаль ніякай карысьці не дала. Гаварылі аб палітэхнізацыі школ, а праграм няма. Акрінспэктарыят не паклапаціўся нават прыслаць патрэбных дакладчыкаў па гэтым пытаньні. Райінспэктару прышлося ехаць у Гомель за дакладчыкам.

І так: школы чакаюць настаўнікаў, настаўнікі—праграм і падручнікаў. Што-ж будзе далей?

П. Шадурскі.

Адны дакладныя запіскі...

Пяць год яўрэйская школа пры Пэдфаку БДУ працавала ў надзвычай цяжкіх умовах. Школа ўвесь час зьмяшчалася ў зусім нягодным і непрыстасаваным памяшканьні, працавала ў дзьве зьмены.

Ня гледзячы на гэта, яна здолела згрупаваць навакол сябе кадр досыць добрых выкладчыкаў і разгарнуць належную работу па вывучэньні раду пэдагагічных праблем.

Але ва ўсёй сваёй інтэнсыўнай рабоце, школа амаль не атрымлівала садзейнасьці з боку Наркамасьветы, унівэрсытэту.

На працягу апошняга году яе перакідвалі з месца на месца тры разы. Праўда, нарэшце, яна дабілася доўгачаканага. Яе перавялі ў адзін з карпусоў унівэрсытэту. Толькі часова, бо у канцы навучальнага году памяшканьне школы было забрана над ВНТУ.

Наркамасьветы вылучыў камісію пад старшынствам т. Мазура для вырашэньня пытаньня аб будынках для беларускай і яўрэйскай школ пры Пэдфаку БДУ.

Камісія, па сваім пасяджэньні ад 3-га ліпеня, пастанавіла прадаставіць школам два іншыя унівэрсытэцкія будынкі, якія знаходзяцца недалёка ад унівэрсытэту.

18-га ліпеня НКА, скасаваў сваю ранейшую пастанову і прадставіў будынак па Савецкай 14 фізкультурнаму тэхнікуму, а яўрэйская школа зноў засталася без памяшканьня да пачатку навучальнага году.

19-га ліпеня акруговая яўрэйская інспэктура зьвярнулася да НКА з падрабязнай дакладной запіскай аб непармальным становішчы, у якім знаходзіцца школа. Але і гэта запіска амаль ніякага ўплыву не зрабіла. Кожная ўстанова хоча скінуць з сваіх плеч гэту справу. Унівэрсытэт накіроўвае ў НКА, апошняя—у акрІНА і гарсавет, але нічога рэальнага ня робіцца.

Нарэшце, у сувязі з ліквідацыяй школы № 24, пранаваралі яўрэйскай школе заняць будынак, які знаходзіцца амаль у другім канцы гораду.

На сёньня школа выселена з свайго будынку, які перайшоў пад ВНТУ і прымушана свае рэчы скласьці ў адным з будынкаў інтэрнату БДУ.

Будынак гэты над школу не падыходзіць. На працягу 5 год ён капітальна не рамантаваўся.

З-за гэтага зрываецца пачатак навучальнага году.

М. Аляхновіч.

Каапэрацыя не падрыхтавала пісьмовых прылад

Чым бліжэй навучальны год, тым больш нэрвова адчуваюць сябе нашы настаўнікі. Бегаюць, шукаюць праграм, паперы, кніжак для сябе і вучняў.

Але ў Крупскім раёне каапэрацыйная кнігарня зусім не падрыхтавана да навучальнага году. Вось яе адказ: «Нічога няма і невядома, калі што будзе».

У адсутнасьці праграм, падручнікаў—вінаваты Наркамасьветы і БДВ. Але ў адсутнасьці пісьмовых прылад і сшыткаў часта вінаваты спажывецкія таварыствы. **У кнігарні Крупскага спажывецкага т-ва было каля 3.000 сшыткаў, была папера. Але сшыткі пайшлі на канцылярскія патрэбы, папера—на пакаваньне селядцоў.** Цяпер-жа, калі ўсё гэта патрэбна для школ, кнігарня гаворыць: «Нічога няма і невядома, калі што будзе».

Каб сваячасова распачаць навучальны год, трэба аказаць дапамогу вопраткай і абуткам дзецям беднаты, батрацтва і калгасьнікаў. Але праўленьне спажывецкага таварыства **гэтым пытаньнем ня цікавілася,** чакаючы «дырэктыў зьверху».

Таму **фонд беднаты ня створаны,** сваячасовая дапамога дзецям ня будзе аказана. Пачатак навучальнага году зрываецца.

Трэба належным органам умяшацца ў гэтую справу.

Ясь КРУПКА.

Увага кузьні Чырвоных камандзіраў

Дырэктывы партыі па вярбоўцы ў вайскова-навучальныя ўстановы выконваюцца слаба

Застаецца яшчэ адзін месяц да прыёму ў вайсковыя школы. Весткі, якія паступаюць у цэнтральную вярбовачную камісію, гаворыць, што ў справе вярбоўкі кандыдатаў у ВНУ ў радзе раёнаў ня ўсё добра. Некаторыя партыйныя і савецкія арганізацыі зусім выпускаюць з-пад увагі такую важную дырэктыву ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы кадраў для Чырвонай армії.

У гэтым годзе настаўлена задача, каб ў ліку прынятых было ня менш 70 проц. рабочых і каб партыйна-камсамольская праслойка была даведзена да 70 проц. А ў нас з гэтым пытаньнем на мясцох, амаль ва ўсіх раёнах, не спраўляюцца. Дзе прычыны гэтага? Няўжо малады рабочы ня хоча ісьці ў вайскова-навучальныя ўстановы? Не, гэта ня так. Малады рабочы, які разумее сваю ролю ў папаўненьні кадраў Чырвонай армії, з вялікім жаданьнем гатоў адгукнуцца на заклік партыі.

Бяда ўся ў тым, што вярбовачныя камісіі не даводзяцца да рабочага за дач, становішча, умоў вярбоўкі ў вайсковыя школы, зусім няма ў цэлым радзе раёнаў распланаванай работы такой вярбоўкі ў ВНУ. Рэдка хто з рабочай моладзі ведае (за выключэньнем тых, хто вучыцца на курсах) умовы прыёму і вучобы ў школе. Мала хто, напэўна, яшчэ ведае, што ў гэтым годзе мяркуецца значнае паляншэньне жыцьця курсантаў як у харчаваньні, абмундыраваньні, так і ў грашовым забесьпячэньні. Праект, які па гэтым пытаньні быў зьмешчан у «Красной Звезде» нашы вярбовачныя камісіі ня выкарысталі.

Некаторыя вярбовачныя камісіі яшчэ да гэтага часу ня ведаюць, колькі пасылаць кандыдатаў у школу. Трэба памятаць, што цэнтральная вярбовачная камісія паказвае колькасьць толькі тых кандыдатаў, якія могуць быць пасланы для паступленьня ў школу за кошт сродкаў дзяржавы. Вярбовачныя-жа камісіі павінны ўлічваць, што можна і трэба пасылаць для паступленьня ў вайсковыя школы звыш паказаенай цэнтральнай вярбовачнай камісіяй колькасьці кандыдатаў, адшукаўшы для гэтага сродкі па лініі Асо, прафсаюзаў і іншых грамадзкіх арганізацый.

Трэба таксама зьвярнуць увагу на тое, што па мясцох не даволі сур'ёзна адносяцца да тых патрабаваньняў (у адносінах да стану здароўя, агульна-адукацыйнай падрыхтоўкі, сацыяльнага становішча), якія прад'яўляюцца пры паступленьні ў ВНУ. У рэзультаце гэтага, прыходзіцца многіх з ліку паступаючых пасылаць назад, працячы такім чынам лішнія сродкі, адрываючы многіх ад непасрэднай работы, уводзячы ў ману непадыходзячых для паступленьня ў ваенныя школы.

Часу засталося да пачатку прыёму мала. Усім раёнам, дзе справа з вярбоўкай у ВНУ абстаіць нездавальняюча, трэба рашуча і энэргічна за месяц, які застаўся, узяцца за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб падрыхтоўцы кадраў для РСЧА.

Васілевіч.

Палепшыць матар'яльна-бытавое забесьпячэньне вайсковых школ

Праект кіраўніцтва вайсковванавучальных школ

Невыстарчальнасьць матар'яльна-бытавога забесьпячэньня ў ВНУ адзначалася і кіраўніцтвам РСЧА, і самімі месцамі. На ўсесаюзным зьлёце ўдарнікаў-курсантаў, начальнік кіраўніцтва вайсковых навучальных устаноў, які асабіста абсьледваў рад вайсковых школ, асабліва падкрэсьліваў патрэбнасьць паляншэньня іх матар'яльна-бытавога становішча.

Зараз кіраўніцтва навучальных устаноў распрацавала адпаведны праект і прадстаўляе яго на зацьверджаньне для правядзеньня ў новым бюджэтным годзе. Праект «Увуза» прадугледжвае наступныя мерапрыемствы:

Па грашовым забесьпячэньні: курсантам вайсковых школ: у падрыхтоўчай клясе—10 руб. у месяц, у малодшай—20 руб., у сярэдняй—25 руб. і ў старшай—35 руб. **Курсантам старшай клясы вайскова-падрыхтоўчых школ і аддзяленьняў—10 руб., курсантам курсаў інструктароў-наезьнікаў** на 1 годзе навучаньня—10 руб., на 2 годзе—35 руб.; курсантам школ чарцёжнікаў-граверaў, мастакоў і фатографаў 2-е і 3-е клясы—10 руб., 4-е клясы—20 руб.; **курсантам вайскова-паветраных школ:** на 1 курсе—15 руб., на 2 курсе—35 руб.; курсантам вайскова-морскае школы імя Фрунзэ: на агульна-адукацыйным курсе—10 руб., на 1-м курсе—20 руб., на 2-м—25 руб., на 3-м і 4-м—35 руб.; курсантам **вайскова-морскае інжынэрнае школы:** на 1-м курсе—15 руб., на наступных—25 руб., 30 руб., 35 руб.; курсантам **паскораных курсаў падрыхтоўкі камандзіраў пяхоты**— 35 руб.

Па рэчавым забесьпячэньні: устанавіць забесьпячэньне ўсіх курсантаў вайсковых школ асобным выхадным абмундыраваньнем—шынэлямі, хромавымі ботамі і суконным фрэнчам і пагазінамі.

Па харчовым забесьпячэньні: палепшыць курсанцкі паёк з 4350 калёрый да 4711 калёрый.

Калі праект «Увуза» будзе прыняты да правядзеньня ў падыходзячым навучальным годзе, паляншэньне матар'яльна-бытавога забесьпячэньня, бязумоўна, дапаможа ў далейшым баявым удасканаленьні і паляпшэньні вучобы ў нашых ВНУ.

Ваенкор.

Як паступіць у вайсковую школу

У 1930 годзе прыём у Аб'яднаную Беларускую Вайсковую Школу будзе праводзіцца з 1 па 12 кастрычніка. У школе ёсьць два аддзяленьні — пяхотнае і артылерыйскае. Правам на паступлень не ў вайсковую школу карыстаюцца ўсе, непазбаўленыя выбарчых праў грамадзянс БССР, ва ўзросьце ад 17 да 22 год, якія маюць агульна-асьветную падрыхтоўку ня ніжэй 1-й ступені і належны стан здароўя.

Пры паступленьні, усе кандыдаты будуць падлягаць мэдыцынскаму агляду, пасьля чаго будуць праходзіць мандатную і навучальныя экзамэнацыйныя камісіі.

Усе грамадзяне, падаўшыя заявы не праз вярбовачныя камісіі, а непасрэдна ў школу, павінны прыехаць у школу (г. Менск, Камунальная, 29) за ўласны кошт, з 2-га па 8 кастрычніка. У выпадку няпрыняцьця ў школу праезд назад таксама за ўласны кошт. Усім грамадзянам, якія едуць для паступленьня ў школу, як праз вярбовачныя камісіі, так і самастойна, трэба мець на руках наступныя дакумэнты: 1. Спраўку аб нараджэньні, 2. Спраўку аб стане здароўя, ад раённага доктара, або доктарскай камісіі, 3. Спраўку аб асьвеце, 4. Аб сацстановішчы, 5. Нясудзімасьці, 6. Характарыстыку ад арганізацыі, дзе служыў, або працаваў, а калі селянін—водзыў ад с/с.

Пры адсутнасьці хаця-б аднаго з указаных дакумэнтаў, кандыдаты ў школы прыняты ня будуць, да атрыманьня ўсіх дакумэнтаў. Каб унікнуць лішняй траты сродкаў і часу на праезд, прапануецца сваячасова набыць усе патрэбныя дакументы.

Заявы асоб, якія не зьявяцца на іспыты да маказанага вышэй тэрміну, разьбіраць ня будуць.

Больш падрабязныя спраўкі аб вайсковых школах можна атрымаць у акруговай вярбовачнай камісіі, або ў раённай дзе такавыя ёсьць.

Памяці беларускага пралетарскага паэты Паўлюка Труса

(Да першай гадавіны яго сьмерці)

28-га жніўня г. г. споўнілася гадавіна сьмерці беларускага паэты Паўлюка Труса.

За гэты год сацыялістычнае будаўніцтва пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі дасягнула нябачаных у сьвеце памераў у галіне рэканструкцыі прамысловасьці і сельскае гаспадаркі і зьнішчэньні апошніх эксплятатарскіх клясаў у краіне — кулацтва на базе суцэльнай калектывізацыі. Адначасна сацыялістычнаму будаўніцтву, іншу рост пралетарскае культуры, як адзінае з суставных частак сацыялістычнага будаўніцтва. Складаючы моцнае зьвяно ў ланцугу культурнае рэвалюцыі, дапамагаючы сацыялістычнаму будаўніцтву і ідучы ў нагу з ім (хоць часамі з вялікімі адставаньнямі), адбываўся і рост беларускай пралетарскай літаратуры. Гэты працэс суправаджаўся абвостраным клясавым змаганьнем на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Адначасна яшчэ-ж адбываўся працэс абвостранага клясавага змаганьня і на ідэалягічным фронце і ў прыватнасьці на фронце літаратуры.

І вось у гэты момант абвостранага клясавага змаганьня мы страцілі аднаго з нашых найбольш адданых, шчырых таварышоў па барацьбе, страцілі тав. Паўлюка Труса. Страцілі яго ў той момант, калі ён праўда, надзвычайна складным шляхам прышоў да пралетарскай літаратуры. Прышоў са сваім творам «Дзесяты падмурак», які па існасьці азначаў рэзкі пералом у беларускай лірыцы — пераход ад вузка-суб'ектыўнай, бяспрадметнай, салодка-абываталькай лірыкі да тэм, да рытмікі сацыялістычнага будаўніцтва. Прыйшоў і ўпэўнена мастацкай мовай сказаў аб Беларусі, якая індустрыялізуецца, аб Беларусі

Фабрык дымных,
і машын.

Гэта быў пачатак. Але сьмерць не дала паэту разьвіцьць усе патэнцыяльныя сілы, якія былі ў ім закладзены.

***

Паўлюк Трус прыйшоў у беларускую літаратуру як кабэар, як чулы лірык-казачнік. Ён заўсёды іграў на сваёй ліры ва ўнісон з народнай песьняй, з народнай казкай.

І прыйшоў у нашу літаратуру прадстаўніком аспоўнае, масы сялянства, якое ў сваім разьвіцьці мае «дзьве душы» — душу ўласьніка і душу працоўнага. Справа тае ці іншае, найбольш усталёўлае клясы—павесьці асноўныя масы сялянства за сабой. У гэтым заключаецца вялікая гістарычная місія рабочае клясы, самае устойлівае і перадавое ў гісторыі чалавецтва клясы, якая павяла сялянства ў якасьці свайго саюзьніка за сабой. Толькі з гэтага, а но з якога іншага пункту погляду становіца зразумелым увесь рознастайны і складаны шлях Паўлюка Труса, які завяршаўся пераходам паэты на рэйкі пралетарскае дэалёгіі.

Асноўную масу сялянства і павёў за сабой творца Кастрычніцкай рэвалюцыі — пралетарыят.

Паўлюк Трус, выступіўшы ў літаратуры як пралетаўнік гэтае асноўнае масы сялянства, адгукнуўся на Кастрычнік шчырым, бунтарным маладым сэрцам:

Чую песьні стыхіі - разводзьдзя,
Ня стрымаць свае вольнае ільні.
Мутуецца старое народзьдзе, —
Кані віх маладога нахлынуў.
О, буйна - кіпучыя хвалі...
Вам ня страшны пажар павальніцы;
У прыгожа люстраныя далі
Разам з вамі і мне ня сьпяніцца.

Так, гэта было поўнае прыняцьце Кастрычніцкай рэвалюцыі, галоўным чынам у яе віхуры, у яе павальніцы, у яе ўсенародным разбураньні старога, у яе «паўстанчых віхурах», у яе вызваленчых подыхах.

І каціліся водгукі гэтых
Па грудзёх срэбнаводнага Нёману;
Пела песьні свае завіруха,
Адбівалася ў сэрцы агнём,
Беларусь убінтоўвала раны.
Беларусь спавівалі пажары
Апускаліся рукі на пана
Ня стрымоўвала помсты душа.

Вось у гэтай помсьце, у гэтым разгуле, у «нястрыманым сакалінным палёце паўстанцаў арлоў - ветрагонаў», якія змагаюцца за «маладога жыцьця акіян», вось у гэтым Паўлюк Трус поўнасьцю прымаў рэвалюцыю.

І ў гэты час вёска ў Паўлюка Труса выступае здаровай, сакавітай, па-новаму прыгожай. —

Вёска, вёска —
Верасьнёвая прозапаць кроў...
Ну, аб чым ты сумуеш сяконьня?
Майго сэрца журбою ня крой,
Яно — звон,
Навясноваму звоніць.

Але нацыяналістычнае атачэньне, у якім знаходзіўся Паўлюк Трус, якім накіроўвае яго творчасьць на рамантычнае захапленьне ня вёскай «амалоджанай» буйныміа крывава-агністымі подыхамі Кастрычніка, а вёскай старой, поўнай свае ўбогасьці, з «ціхім лернікам пад сасною». Выступае сумны вобраз сіраты Алесі:—

Алеся, бедная Алеся,
Краса наднёманскіх дзяўчат,
Ты сінь вазёрнага Палесься,
Адбіла ў сонечных вачах.
Адбіла чэрвеньскія зоры.
Смуглярасьць ціхіх вечароў.
І гнеў зажмыканай мора, —
І казкі дзіўныя палёў.

У гэту старую, мінулую ўбогую вёску, паданую ў глыбокалірычных словах, мы адчуваем ужо нават у першых такіх званы «бунтарскі» пэрыяд творчасьці Паўлюка Труса, нарэшце, зборнік «Вершы». У гэтай тэндэнцыі да выяўленьня старое вёскі, з адначасовым захапленьнем рэвалюцыйным змаганьнем і выступае выразна дваістасьць сацыяльнае прыроды творчасьці Паўлюка Труса, пэрыяду «Ветры буйныя».

***

Захапленьне прыродай, адарванай ад людзей, якія працуюць у майстэрні гэтай прыроды, «акорды песьні», якія раней Паўлюк Трус у «эрэбнай радасьці пасіўнасьці» — адрываюць яго ад канкрэтнага сялянскага жыцьця, і гэтае канкрэтнае жыцьцё ён бачыць не ў і ранім поступе новага на вёсцы, а ў вобразе жанчыны, якая

...йдзе
У блізкае сяло...
На пальцах кроў,
Расхлістаныя грудзі.
Ідзе дарогаю,
Вачыма блудзіць,
Руку кастлявую
Уздымае над чалом.
Паволі хрысьціцца...

У гэты-ж час усплывае рамантычны, афарбованы ў народныя колеры вобраз цыганкі Марыулы. Зноў выступае вобраз сіраты Алесі, яшчэ больш пяпчаснай у сваім разьбітым каханьні.

Як вяночкі плавалі на вадзе.
Выхадзіла дзеўчына паглядзець,
Выхадзіла дзеўчына паглядзець.
Ці ня едзе суджаны, ці ня йдзе.

Ой ня едзе суджаны і ня йдзе;

Дзе-ж красуня дзеўчына, шчасьце дзе?
І нагаслі водсьветы на вадзе.

І ў гэтай ідэалізацыі мінулае, старое вёскі, у захапленьні сумным вобразам сіраты, які так характэрны для аджыўшай убогай вёскі, у гэтым захапленьні вобразам старога лірніка адчуваецца моцны ўплыў на творчасьць Паўлюка Труса нацыянал - дэмакратычнага атачэньня, якое частова адрывала яго ад поўных, сьвежых, адровых вобразаў сучаснае вёскі і кідала паэту ў бок захапленьня «слаўнай мінуўшчынай».

Гэты пэрыяд творчасьці Паўлюка Труса, які характэрны падпаданьнем паэты пад уплыў, востра распусьціўшай у той час свае кіпцюры нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі, — адзначаецца ўбогасьцю агульнага ідэёвага зьместу вершаў Паўлюка Труса, вялікай дапінай фармальным спробам у галіне культываваньня нацыянальных санэтаў, трыялетаў і трымпіхаў.

Усе ранейшыя Трусовы адважныя «арлы - ветрагоны» — Янка, Якім зьнікаюць з фэрмы мірнага будаўніцтва. Гэтым і характарызуецца другі пэрыяд у творчасьці Паўлюка Труса. Пэрыяд ціхага, квола - мірнага суму, пэрыяд зборніку «Ветры буйныя». У гэты час старое, зацьвілае нацыянал-дэмакратычнай тванью, якое жыло побач з пікрагоньнем, малады бунтарсіны, кіпіо і ўмацалася з ім, встрам буйным захлістае «вясновы звон маладога сэрца» Паўлюка Труса.

***

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны, далейшае абвостраньне клясавага змаганьня, рост пралетарскае культуры — адгукваюцца ў Трусе шлях грунтоўкі ў краіне і абумовілі пераход Паўлюка ТРУСА на рэйкі пралетарскае літаратуры.

Набліжэньне Паўлюка ТРУСА да пралетарскае літаратуры і перамаганьне нацыяналістычнае тванї ўжо выразна адчуваецца і ў творы, якіяя даводзілі далёкім, ад пралетарскага — «Чырвоныя Ружы». У гэтай ліра-паэме, дзе апісваецца грамадзянская вайна, Паўлюк ТРУС ад свае мінулай хваравітай, поўнай лірычнага суму, творчасьці зноў пераходзіць да захапленьня сьвежым росквітам «чырвоных руж».

І ў красе за вакном
Расьцьвілі яны зноў, —
Расьцьвілі ружы кветкі над краем.
Расьцьвілі і ў
Вянкі чароўныя зьвіліся
На сьцежках бур і навальніц...
— Дзе кроў сачылася калісьці, —
Ня меркнуць заўтрага агні...
Агні гарацьць... І ў хвалях Сожу
Губляюць пэрлы пад гарой
Там песьні льлюцца з-Запарожжа
Шуміць сярдзіта Валхаўстрой.
Агні гарацьць... Агні ў надзор'і
Залатацьветам шалясьціць,
Пад песьні казачных прастораў
Пад звон мэлёдыі жыцьця.

Вось «Дзесяты Падмурак» канчаткова разбурыў гэтыя казачныя, авеяныя мінуўшчынай, — упесенай у творчасьць Паўлюка ТРУСА нацыяналістычнымі ўплывамі і станавіў новыя прасторы —

Волатаў муроў.

Надзвычайнымі творчымі цяжкасьцямі Паўлюк Трус прыйшоў ад:

Краю лягенд,
адвечных песень-казак,
Краю паэм —
бальзам жывых крыніц...
Краю балот,
тугі азёраў наскіх,
Краю цішы
і громаў навальніц...
Краю лясоў,
мінулых дзён паўстаньня,
Краю нізін
прастораў дальніх шыр
Да
Краю фабрык дымных і машын.

У «Дзесятым падмурку» Паўлюк Трус змог паказаць усю складанасьць працэсу пераўтварэньня краю жабрацкага: «лягенд», «крыжоў», «магіл», «курганаў», краю тугі, «бялявых кос туманаў» у край сінабудаўскіх фабрык і машын.

І ў гэтым нараджэньні новае фабрычнае індустрыяльнае Беларусі, якая разбурае твань беларускіх балот, патрыярхальчыну і «легендарную» дзікасьць старой вёскі, сталася і адмаўленьне ранейшае творчасьці Паўлюка Труса, у яе нацыяналістычных уплывах, наколькі гэтая творчасьць апявала стары край лягенд балот, вазёраў і стаўленьне новае —

Песьні Асінбуду
і захапленьне музыкай турбін.

І нібы пэнарокам у творы «Дзесяты падмурак» адбіты ўвесь творны шлях Паўлюка Труса ў яго перамаганьні і стапаўленьні новага вышэйшага этапу ў разьвіцьці творчасьці паэты — стапаўленьні песьні індустрыяльнае Беларусі.

Пэдарма ў пачатку Паўлюк Трус, блукаючы па несваіх дарогах, разважае

На якой-жа тая доля
Па якой нядоля.
Па якой-жа тое шчасьце,
а ці ліха-гора
Мяне стрэне на чужыне,
Стрэне й пагаворыць.

І сталася так, што пасьля ўпартага змаганьня дзьвёх процілеглых тэндэнцый якое (змаганьне) прайшло і праз ліра-паэму «Чырвоныя ружы» перамог шлях апяваньня будаўніцтва рабочае клясы.

Дзе раджаюцца надзеі
У муках чалавечых...
Я пайду каб абагрэць іх
песьняю адвечнай.

У «Дзесятым падмурку» Паўлюк Трус паказвае ўвесь шлях гэраічнага змаганьня рабочае клясы за савецкую Бе

Апартуністыя фабрыкі „Адраджэньне“ ня верацъ у творчую ініцыятыву мас

Прамфінплян 1930-31 г. хаваецца ў дырэктара ў стале

Заданьні бягучага году да варштату не даведзены

Хаос і бясплянавасьць павялічваюць прарывы

Фабрыка **«Адраджэньне»** (Менск) з 15 мая перайшла ў распараджэньне ВСНГБ. Прадметамі вырабу гэтай фабрыкі зьяўляюцца вага і ложкі. Асабліваe значэньне мае фабрыка, як асноўны вытворца **вагі, бо ў БССР** другіх фабрык на вырабе вагі—няма.

У цяперашні момант, у сувязі з абожжа-загатоўкамі, плянавым заданьні фабрыкі «Адраджэньне» на чацьверты квартал па вырабе вагі набываюць асаблівае значэньне, бо нашы абожжа-загатоўчыя арганізацыі мала забясьпечаны вагою. Гэта абавязвае фабрыку зьвярнуць максымум увагі на гэту галіну вытворчасьці. Але факты гавораць за тое, што патрэбныя тэмпы ў галіне вырабу вагі на фабрыцы далёка не дасягнуты.

Бяз пляну

Фабрыка **«Адраджэньне»** працуе бяз усякага прамфінпляну. Яна мае толькі заданьне ад Белмэталяаб'яднаньня на чацьверты квартал. Паводле гэтага заданьня, фабрыка павінна выпусьціць 6.869 шт. вагі, 6.000 ложкаў і 3000 жалезных крэслаў.

Выкананьне гэтага заданьня над пагрозай зрыву. Так, напрыклад, цэх па вырабе ложкаў за апошнія дзьве дэкады, выпусьціў 511 ложкаў замест 2.000, прадугледжаных плянам.

Асабліва дрэнна стаіць справа з вагавым цэхам, які з 15 мая перайшоў ад заводу «ЭНЭРГІЯ» ў распараджэньне фабрыкі «Адраджэньне». Заданьне на вырабе сталовай вагі гэтым цэхам выканана ўсяго на 37 проц., а на вырабе дзесяцічнай вагі—на 63 проц.

Гэты ганебны провал атрымаўся ў выніку таго хаосу і бясплянавасьці, якія пануюць на фабрыцы «Адраджэньне».

Як мы ўжо адзначылі, фабрыка ня мае свайго прамфінпляну, а працуе ўсьляную. Кожны дзень пачынаюць новыя работы, непрадугледжаныя плянавымі заданьнямі Белмэталяаб'яднаньня. Напрыклад, частка рабочых зараз вырабляе цацкі і дзіцячыя вэлясыпэды, што не ўваходзіць у плянавыя заданьні фабрыкі. Абавязацельствы, узятыя перад аргбудам—загатовіць 3.000 жалезных крэслаў—ня выконваюцца. На сёнешні дзень загатоўлена толькі 200 крэслаў, жэля таксама трэба перарабляць. Загадчык вытворчасьці кажа, што «ляпей заплаціць 3.000 руб. няўстойкі, чым выканаць гэтае абавязацельства».

Трагедыя вагавога цэху

Вагавы цэх, які на заводзе «Энэргія» выконваў сваю праграму **на 115 проц.**, зараз ня выконвае яе. Спэцыяльная брыгада «лёгкай кавалерыі» фабрыкі «Адраджэньне», у складзе т. т. Копылава, Шабуня, Савіцкага, Вальфсона, якая займалася вывуэньнем становішча вагавога цэху, зрабіла вывады, што прычынай невыкананьня праграмы вагавым цэхам зьяўляецца тая бясплянавасьць і безадказнасьць, якія панавалі ў часе ўстаноўкі гэтага цэху.

Паводле пляну, абсталяваньне вагавога цэху павінна было закончыцца да 18 ліпеня. Між тым канчатковая ўстаноўка **яшчэ ня зроблена** і на сёнешні дзень. Адміністрацыя фабрыкі зусім нядбайна адносілася да стварэньня нармальных умоў работы цэху. Паводле загаду дырэктара фабрыкі **Козака**—30 столяраў, занятыя на фабрыцы, былі адпушчаны. Апошнім выявіўся востры недахват у рабочых-сталярох, што і затрымала на некаторы час абсталяваньне цэху.

Забесьпячэньне цэху патрэбнымі машынамі тармозіцца. Нават такія варштаты, як рэвольверны, да гэтага часу ня перавезены з заводу «Энэргія» на фабрыку «Адраджэньне».

Нельга не адзначыць злачынных адносін адміністрацыі заводу «Энэргія» да перадачы абсталяваньня цэху фабрыцы «Адраджэньне». Варштаты вагавога цэху, зьнятыя з фундаманту, валяцца на працягу тыдню на заводзе «Энэргія». Адміністрацыя заводу, упарта не перадае гэтых варштатаў фабрыцы «Адраджэньне». Прэсы таксама затрымліваліся на працягу двух тыдняў.

Матар'ялы, прызначаныя вагавому цэху, і зараз не пераданы фабрыцы «Адраджэньне»

Усё гэта прывяло да ганебнага прарыву, які зараз ёсьць у вагавым цэху.

Праваапартуністычная практыка

Жыцьцё паказала, што там, дзе работа праходзіць габінэтным парадкам, бяз шырокага ўдзелу рабочых мас—заўсёды будуць прарывы ва ўсіх галінах работы.

Праваапартуністычнае нявер'е ў творчую ініцыятыву рабочых мас знайшло сваё адлюстраваньне на фабрыцы «Адраджэньне».

Намесьнік дырэктара фабрыкі **т. Бабіцкі** рыхтуе прамфінплян на 1930-31 год разам з экапамістым. **Рабочыя фабрыкі і ня ведаюць нават аб гэтым пляне**, а адміністрацыі **і ня думае вынесьці яго на абгаварэньне рабочых.** Бабіцкі гэта тлумачыць тым, што **«рабочыя ня могуць складаць пляну».**

Ідэя «сустрэчнага прамфінпляну» не дакацілася да фабрыкі. ФЗК пытаньнямі падрыхтоўкі «сустрэчнага прамфінпляну» зусім не займаўся. Наадварот, наглядаецца ігнараваньне ідэі «сустрэнага прамфінпляну», што выявілася **ў невыкананьні рабочых прапаноў.** З 94 рабочых прапаноў, **ня выкананы 54 прапановы.** У выніку ўсяго гэтага зараз пяхіх прапаноў з боку рабочых не паступае. ФЗК ня прыняў ніякіх мер да збору рабочых прапаноў у скарбонку «сустрэчнага прамфінпляну».

Сапспаборніцтва і ўдарніцтва—на паперы. Пытаньнямі кіраўніцтва сапспаборніцтвам і ўдарніцтвам ні парткалектыў, ні ФЗК не займаліся. Нават няма уліку сапспаборніцтва.

Плянавыя заданьні фабрыкі «Адраджэньне» не даведзены да цэху, варштату і паасобнага рабочага. Адрача майстраў цэхаў, ніхто ня ведае аб заданьнях цэху.

Усё гэта гаворыць за тое, што партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі фабрыкі не паварунуліся «тварам да вытворчасьці». Той факт, што сам ФЗК ня ведае становішча фабрыкі і лічбовых паказальнікаў выкананьня заданьняў, лепш за ўсё пацьвярджае гэта.

Гэтая-ж праваапартуністычная практыка і ў дадатак бясплянавасьць і хаос, якія панавалі на фабрыцы «Адраджэньне» і правялі фабрыку да невыкананьня заданьняў.

Такая «практыка» надалей нецярпіма.

І. Ляўковіч.

ЯШЧЭ 366 ТОН ПАПЕРЫ—

вось „сустрэчны“ рабочых „Чырвонай Зоркі“

НОВЫ ПРАМФІНПЛЯН ДАВЕДЗЕНЫ ДА КОЖНАГА РАБОЧАГА

Распрацоўка прамфінпляну на паперовай фабрыцы «Чырвоная Зорка» была распачата з першых дзён жніўня. Улічваючы некаторую зьмену асартымэнту, агульна - гадавы выраб паперы, вызначаны на 1930-31 год, складае 12.010 тон супроць 11.510 гэтага году. Гэтыя кантрольныя лічбы абмеркаваны на ўсіх цэхавых сходах. Рабочыя прымаюць актыўны ўдзел у абгаварэньні гэтых памчэньняў, унесьлі рад прапаноў і высунулі «сустрэчны прамфінплян», які ў адносінах вырабу прадукцыі перавышае раней вызначаны плян на 3 проц. Такім чынам, канчатковая праграма на 30-31 год складае 12.376 тон паперы. Асабліва важна адзначыць павялічэньне вырабу культурнага гатунку паперы да 5.530 тон супроць 4.838 тон гэтага году. Зьніжэньне сабекошту вызначана на 10 проц., павялічэньне прадукцыйнасьці працы на 9,8 проц.

Будзе праведзены рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў. У другім квартале будзе пушчаны дрэўнамасны завод, які дасьць да канца году 900 тон дрэўмасы. У капітальныя работы на 30-31 г. ключаны: устаноўка казана, замена 500 HP паравой машыны новай у 650 HP. Машыны ўжо закуплены і ў пачатку верасьня павінны прыбыць на фабрыку. Таксама ўключана скансэньне пабудовы 3-хпавярховага інтэрнату, пачатак пабудовы 32-кватэрнага дому, пабудова клюбу, пачатак пабудовы новай сілавой станцыі на 3000 клв. першай чаргі і інш.

Адначасова з распрацоўкай агульнага прамфінпляну, ён даводзіцца да кожнага цэху, аддзелу, варштату і паасобнага рабочага, прычым з 1 кастрычніка ўсе цэхі пераводзяцца на **гаспадарчы разрахунак.** Для кожнага цэху распраданы асобны прамфінплян, які будзе вывешаны ў цэху.

Агульна - фабрычны і цэхавыя пляны будуць надрукаваны і разданы рабочым на рукі. Кожны рабочы будзе ведаць, якія задачы стаяць перад фабрыкай, што і як ён сам павінен рабіць, каб гэтыя задачы былі выкананы.

Ня менш актыўны ўдзел прынялі рабочыя ў абмеркаваньні пераходу фабрыкі з 1-Х г. г. **на 7-гадзінны рабочы дзень**, да якога фабрыка таксама энэргічна рыхтуецца.

Актыўны ўдзел рабочых, алм-тэхн. пэрсаналу і ўсіх арганізацый фабрыкі ў распрацоўцы прамфінпляну сьведчыць аб тым, што рабочыя калектыву фабрыкі змагаюцца за паперу, ведаючы, што папера — гэта **матар'яльная база культурнай рэвалюцыі.** Гэты актыўны ўдзел сьведчыць, што «Чырвоная Зорка», якая атрымала першую прэмію па БССР за выкананьне пляну гэтага году, з посьпехам выканае і праграму трэцяга году пяцігодкі.

Л. Г. ПЕРЭЛЬ.

НА РЭЙКІ УДАРНЫХ ТЭМПАЎ

Гэтымі днямі адбылася другая агульна-фабрычная вытворчая канфэрэнцыя фабрыкі **«Беларуска»**, якая падарыла вынікі мінулага гаспадарчага году і вызначыла шляхі далейшай працы на 1930-31 гаспадарчы год.

У сваёй пастанове канфэрэнцыя асабліва падкрэсьліла той факт, што фабрыка ў мінулым недавыканала прамфінплян. Канфэрэнцыяй прынята пастанова, паводле якой рабочыя абавязуюцца **арганізаваць «сустрэчны прамфінплян» і павялічыць выпуск прадукцыі па цэлюлёідных грабнёх на 250 проц. і па галалітавых гузіках— на 505 проц. супроць мінулага году.**

У далейшым рабочыя фабрыкі абяцаюць, пад кіраўніцтвам партыйных і прафесыянальных арганізацый, даючы рашучы адпор апартуністым усіх колераў,—выканань свой «сустрэчны прамфінплян».

Пад пагрозай зрыву

Урадам намечаны да пабудовы ў гэтым годзе ў Бабруйску цэлюлёзнага заводу. Паводле меркаваньня — пабудова гэтага заводу павінна была пачацца ў гэтым годзе, але справа варушыцца вельмі марудна.

Да гэтага часу яшчэ няма пляну пабудовы галоўнага корпусу заводу. Пабудаваныя баракі для рабочых стаяць яшчэ без вакон. Адведзены барак для сталоўкі больш падыходзіць пад сьвінарнік. Будаўнічы матар'ял зусім не дастаўляецца і няма ніякае надзеі, што будаўнічы матар'ял будзе дастаўлены ў гэтым годзе.

Цікава ведаць — хто вінаваты ў гэтай агіднай справе зрыву працы па пабудове цэлюлёзнага заводу.

НК РСІ ПАВІННА ЗАЦІКАВІЦЦА ГЭТАЙ СПРАВАЙ. С. К.

Ініцыятыва рабкораў

Група рабкораў Бабруйску па сваёй ініцыятыве арганізавала «суботнік» па зборы папяровай макулатуры. Рабкоры сабралі 1.000 кгр. макулатуры ў Бабруйскім ЦРК і 400 кгр.—у Бабруйскім аддзяленьні Цэнтрархіву. Характэрна адзначыць, што з макулатуры, якая сабрана ў Цэнтрархіве—каля 400 кгр.—зусім добрае паперы, якая можа быць скарыстана на канцылярскія патрэбы.

Трэба адзначыць, што ў Бабруйскім аддзяленьні Цэнтрархіву можна сабраць яшчэ каля вагону макулатуры, але загадчык архівам—тав. Тараймовіч марудзіць з перадачай непатрэбнай макулатуры. Ён кажа: «калі не здамо ў гэтым годзе, дык гэтая макулатура прыгадзіцца і на будучы год».

Рабкор.

ЛІКВІДУЮЧЫ АКРУГІ, УМАЦУЕМ РАЁНЫ

Дэзэртыры

З фронту сацыялістычнага будаўніцтва

Рэдакцыя «Зьвязды» і Менскі ліквідком зрабілі праверку яўкі ў раёны накіраваных з акругі работнікаў.

Менскія акруговыя ўстановы, як вадома, ліквіданы з 15 жніўня. Ужо прайшло два тыдні, але на сёнешні дзень з 81 работніка, якія накіраваны на работу ў раён, 37 яшчэ не зьявіліся бяз усякіх грунтоўных прычын (весткі на 12 раёнах.

Вось яны дэзэртыры з працоўнага фронту:

У Сьмілавіцкі раён не зьявіліся—**Паляшчук Г. П., Грэноза З. Я., Васілеўскі, Марчышэй Б. Я., Захарэвіч, Кундзін Р. С., Забаўскі І. Л.;**

у Самахвалавіцкі—Камінскі М. Г., Федаровіч М. Б., Забнёў І. А., Дубіна Я. П., Вярбіцкі М. М. Дашкоў Г. А.;

у Смалявіцкі—Грынфэльд А., Камянецкая Л.;

у Койданаўскі—Лашакурскі П. К.; у Заслаўскі—Янсон Я. А.; у Капыльскі раён—Вількот К. Р., Хадасэвіч, Ткачоў Н. Ф., Новікаў; у Плешчаніцкі—Вазьнячук, Бэрштэйн, Б. Р., Валькоўскі; у Барысаўскі—**Грузакоў Д. Е., Яцыновіч;** у Бягомльскі—**Міткін І. М., Бельскі З. К., Галіцкі;** у Астрашыцка-Гарадзецкі—**Балатніцкі, Дабавалеўскі П. В.;** у Вузьдзенскі—**Захарэц, Кудзелік, Сарокін;** у Лагойскі—**Серафімоўскі, Гаркавенка П. П., Буткевіч С. А.;**

Ні адзін з паказаных таварышоў це падаў заявы ў ліквідком аб прычынах нявыезду. **Усе яны сьвядома ўхіляюцца ад паездкі, груба парушаючы партыйныя дырэктывы і партдысцыпліну.**

Апрача іх, яшчэ 14 асоб, прызначаныя у раёны, на працягу 2 тыдняў не налічылі патрэбным зьявіцца за пуцёўкамі. Вось яны:

Вайцахоўскі (заг. акрфа), **Сьнежань** (акрана), **Хведчанка** (акрпаляведсаюз), **Гронас** (Белкаапсаюз), **Пішчыкаў** (акрсуд), **Родбіч** (інспэктар па сілаве), **Татарчук** (нам. інспэкт. працы), **Філько** (акрстрахкаса), **Шумкевіч, Сепях** (інструктар акрфа), **Замасьцянаў** (Сампрымсаюз), **Чарнабыленка** (акрсавет МОПР), **Паўловіч** (прафтэхшкола).

Ухіленьне ад работы ў весцы, нежаданьне пакінуць горад нельга інакш разглядаць, як злоснае дызэртырства з фронту сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы. Гэта ёсьць па сутнасьці апартунізму на практыцы, які паслаблае пазыцыі партыі на вёсцы, зрывае дырэктывы партыі аб узмацненьні раёнаў і гэтым самым палягчае работу клясавага ворагу.

Усіх тых, хто на працягу 1-2 дзён ня выедзе на прызначанае месца трэба прыцягваць да самай жорсткай партыйнай адказнасьці, выключаючы іх з партыі, як дэзэртыраў з галоўнейшых участкаў сацыялістычнага будаўніцтва.

СТВАРЭНЬНЕ АПАРАТУ РАЙГАНДЛЮ--

ПЕРШАЧАРГОВАЯ ЗАДАЧА

Арганізацыя апарату райгандлю, у зьвязку з пачаткам хлебазагатоўчай кампаніі, зьяўляецца зараз першачарговай задачай. На жаль, на сёнешні дзень амаль ні ў адным раёне яшчэ няма раённых інспэктароў гандлю. У тых раёнах, дзе раённыя інспэктуры ўжо арганізаваны, на пасаду раённых інспэктароў вылучаны таварышы, якія ніколі не працавалі ў органах Наркамгандлю і з гэтай важнейшай работай амаль што не знаёмы.

Акруговыя інспэктары гандлю замест таго, каб быць накіраванымі на работу ў раёны па сваёй спэцыяльнасьці, былі перакінуты на іншую работу. На толькі акруговыя інспэктары, але і паогул ні адзін з работнікаў акргандлю не пасланы ў раён для работы ў інспэктарыяце гандлю.

Мясцовыя арганізацыі не аддаюць гэтаму пытаньню належнай увагі. На ўсе прапановы Наркамгандлю паведаміць прозьвішчы вылучаных работнікаў для таго, каб завязаць з імі сувязь, ні з аднаго раёну, няма адказу.

Такое-ж становішча і па лініі Саюзхлеба, Белмяса і Белплодагародніны, якія ніяк ня могуць наладзіць сувязь са сваімі раённымі упаўнаважанымі.

У большасьці раёнаў гэтыя упаўнаважаныя ўсё яшчэ ня выдучаны.

Партыйныя арганізацыі на мясцох павінны аддаць гэтаму пытаньню належную ўвагу, дабіцца хутчэйшага выдучэньня адпаведных работнікаў на пасаду раённых інспэктароў гандлю.

А.

ПАЛЕПШЫЦЬ БЫТАВЫЯ УМОВЫ НОВЫХ РАБОЧЫХ

«Ня гледзячы на рад катэгарычных прапаноў партыйных і савецкіх арганізацый Віцебшчыны аб неадкладным выезьдзе маблізаваных акруговых работнікаў у раёны, большая частка з іх яшчэ ня выехала.

У Сураскі раён з 16 мабілізаваных адказных работнікаў—**прыехалі толькі 5.**

Некаторыя мабілізаваныя работнікі яшчэ ня могуць разьвітацца з акругай. Яны ўсё яшчэ «апелююць» перад вышэйшымі органамі аб застаўленьні іх у горадзе.

З прычыны таго, што ня ўсе мабілізаваныя работнікі выехалі ў раён, работа раённых арганізацый значна адстае. Гэта асабліва адчуваецца пры правядзеньні ўборкі ўраджаю, асенняй пасеўнай кампаніі і хлебазагатовак.

Бытавыя ўмовы новых работнікаў вельмі дрэнныя. Большасьць з іх кватэрамі не забясьпечаны. **Гарадзкія саветы нічога ня робяць, каб забясьпечыць новых работнікаў кватэрамі.**

На просьбу акруговага работніка, які прыехаў у Сураскі раён—дапамагчы яму знайсьці кватэру,—работнікі РВК адказалі, што няма часу зараз займацца такой мізэрнай справай.

Такія адносіны яшчэ больш павялічваюць нежаданьне акруговых работнікаў ехаць у раёны.

Я. С—ны.

Дэзэртыраў—вон з партыі

За ўхіленьне ад паездкі ў раён, Мазырскі АК КП(б)Б выключыў з радоў партыі Крыпавіцкага (члена праўленьня акрмалжыўсаюзу).

ЗМАЗАЛІ ВЫТВОРЧУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ

Кіраўнікі менскай абутковай фабрыкі захацелі абярнуць рабочую канфэрэнцыю ў пустую фармальнасьць

Невыкананьне праграмы ў 118.400 пар абутку патрабуе сапраўднай мабілізацыі мас на ліквідацыю прарыву

Заўчора ў садзе друкароў адбылася канфэрэнцыя рабочых менскай абутковай фабрыкі, прысьвечаная новым кантрольным лічбам і «сустрэчнаму прамфінпляну». Быў заслуханы даклад дырэктара фабрыкі аб кантрольных лічбах і даклад старшыні вытворчага сэктару фабкому аб «сустрэчным прамфінпляне».

Трэба сказаць, што канфэрэнцыя была падрыхтавана **вельмі дрэнна.** Замест 6 гадзін, канфэрэнцыя пачалася ў 8½. Замест 300 рабочых, мінімум якіх павінны былі прыйсьці на канфэрэнцыю, зьявілася ня больш 100 чал. Толькі ў канцы канфэрэнцыі сабралося яшчэ 50 чал.

Канфэрэнцыя прайшла **вяла.** Пасьля дакладаў выступала ўсяго 3 чал. —**два прадстаўнікі трэсту** і адзін рабочы фабрыкі, які паказаў, што **«сустрэчны прамфінплян» яшчэ мала распрацаваны ў цэхах і што кантрольныя лічбы не даведзены да цэхаў і машыны.** На гэтым спрэчкі скончыліся і была ўхвалена раней падрыхтаваная рэзалюцыя, якая даручае дырэкцыі і фабкому, пры зацьвярджэньні кантрольных лічбаў, больш іх удасканаліць у бок павялічэньня, выявіць усе скрытыя магчымасьці фабрыкі, перавесьці цэхі на гаспадарчы разрахунак і, апошні пункт,—**не пазьней 1-га кастрычніка давесьці новы прамфінплян да кожнага рабочага.** На гэтым старшыня канфэрэнцыі Гурвіч абвясьціў канфэрэнцыю закрытай.

Адразу было відаць, што канфэрэнцыя не падрыхтавана і што рабочыя не мабілізаваны для вырашэньня на канфэрэнцыі такога важнага пытаньня, як кантрольныя лічбы і «сустрэчны прамфінплян».

Праверка наладжаная ўчора рэдакцыяй «Зьвязды», гэта пацьвердзіла.

Старшыня канфэрэнцыі т. Гурвіч на запытаньне супрацоўніка «Зьвязды», якую мэту ставіла перад сабой канфэрэнцыя, заявіў наступнае: **«На канфэрэнцыі мы і ня думалі праводзіць спрэчак.** Мы хацелі толькі, каб рабочыя ведалі, што ў нас ёсьць кантрольныя лічбы, а наконт недахопаў мы шмат гаварылі і да канфэрэнцыі».

Аб тым, ці сапраўды кантрольныя лічбы **добра** прапрацаваны, сьведчыць і выступленьне адзінага рабочага на канфэрэнцыі, і рэзалюцыя яе аб тым, што кантрольныя лічбы **не даведзены да рабочых.** Уся прапрацоўка працягвалася **паўтары тыдня і не ахапіла ўсіх рабочых фабрыкі.**

Як на фабрыцы рыхтаваліся да канфэрэнцыі? Тав. Гурвіч заяўляе, што на дварэ фабрыкі вывесілі вялікі плякат, апрача таго абвясьцілі па ўсіх цэхах. Але вось, што заяўляюць паасобныя рабочыя:

— Аб канфэрэнцыі я нічога ня ведаў, **здаецца не абвяшчалі,** — заяўляе рабочы **Капуткін** з машыннага цэху.

— Канфэрэнцыя? Якая канфэрэнцыя? **Нічога ня ведаю,** — адказаў рабочы **Бяспалаў.**

Рабочы **Беленькі** кажа, што ён даведаўся аб канфэрэнцыі толькі **за поўгадзіны да канцу рабочага дня.** Рабочы **Чэрнецкі** быў у гэты дзень выхадным, **раней** аб канфэрэнцыі ён нічога ня чуў. Рабочы **Шулькін** прышоў на канфэрэнцыю а 8 гадз., бо, паводле яго слоў, **ніхто** не сказаў, а якой гадзіне пачнецца канфэрэнцыя. **Тав. Гольдзін** — рабочы загатовачнага цэху — па канфэрэнцыі ня быў і кажа, што **ніхто яму аб ёй не паведамляў.**

Усе гэтыя адказы сьведчаць аб тым, што прафработнікі не мабілізавалі рабочых для ўдзелу ў канфэрэнцыі і не растлумачылі яе значэньня.

Таксама ніхто не паклапаціўся скарыстаць гэтую канфэрэнцыю для пастаноўкі пытаньня **аб ліквідацыі прарываў бягучага году,** ня гледзячы на тое, што паводле заявы дырэктара, **праграма невыканана на 118.400 пар абутку.**

Мы лічым, што вытворчая канфэрэнцыя, прысьвечаная кантрольным лічбам і «сустрэчнаму прамфінпляну» павінна насіць **выключна практычны характар,** а ня толькі **фармальны,** і паслужыць **адным з асноўных мэтадаў мабілізацыі ўвагі мас на ліквідацыю прарываў і выяўленьня скрытых вытворчых рэсурсаў прадпрыемства.** Такая канфэрэнцыя павінна яшчэ больш узьняць энтузіязм мас па барацьбу за прамфінплян, арганізаваўшы перадавых рабочых на барацьбу з усімі недахопамі ў вытворчасьці (прагуламі, прастоямі і г. д.). **І павінна быць прасякнута сапраўднай бальшавіцкай самакрытыкай.** Думка кіраўнікоў абутковай фабрыкі, што канфэрэнцыя павінна толькі абмежавацца зацьвярджэньнем «сустрэчнага прамфінпляну», нават без яго абгаварэньня, зьяўляецца памылкай.

Гэта памылка павінна быць выпраўлена і вытворчая канфэрэнцыя склікана ў **другі раз** — пасьля лепшай падрыхтоўкі і сапраўднай мабілізацыі мас.

М. Цырлін.

Дапаможам абсьледваньню работы КП(б)Б

Да ўсіх рабселькораў БССР

У кастрычніку месяцы г. г. камуністычная партыя бальшавікоў Беларусі будзе рабіць справаздачу перад Цэнтральным Камітэтам нашай партыі аб стане і рабоце КП(б)Б. Справаздача нашай арганізацыі перад ЦК УсеКП(б) мае **вялізарнейшае палітычнае значэньне.** Для абсьледваньня работы КП(б)Б, ЦК УсеКП(б) камандыраваў да нас ўсіх адказных інструктароў, якія ўжо прыступілі да работы. Абсьледваны будуць паасобныя раёны, фабрыкі і заводы, сьпіс якіх апублікаваны ў «Зьвязьдзе» № 201 ад 29/VIII.

Праграма абсьледваньня ахапляе ўсе асноўныя палітычныя, гаспадарча-культурныя пытаньні будаўніцтва Савецкай Беларусі. Гэта вялізарнейшая работа па абсьледваньні можа быць праведзена добра толькі **пры актыўным падтрыманьні ўсіх членаў партыі, рабочых, калгасных, бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і рабселькораў.**

Рабселькоры, якія зьяўляюцца **сыгналізатарамі партыі** аб усіх недахопах і дасягненьнях сацыялістычнага будаўніцтва, **павінны прыняць актыўнейшы ўдзел у правядзеньні праверкі.** Пад лёзунгам бальшавіцкай самакрытыкі, на старонках пасьценгазэт, пматтыражак, цэнтральнага органу КП(б)Б газэты «Зьвязда» яны павінны выяўляць усе сапраўдныя **недахопы** ў нашай работе.

Побач з гэтым, трэба зрабіць агляд нашых **дасягненьняў** у галіне сацыялістычнага будаўніцтва.

У раёнах, на фабрыках і заводах, дзе будзе праходзіць абсьледваньне, **рабкораўская арганізацыя павінна цапкам мабілізаваць сябе ў дапамогу камісіі па праверцы.**

Трэба зараз-жа стварыць рабкораўскія **ўдарныя брыгады, пасты** для рэгулярнага асьвятленьня на старонках друку алмоўных і станоўчых бакоў у рабоце нашай арганізацыі.

Рабселькоры ў сваіх допісах павінны асьвятліць, як фабрыкі і заводы выконваюць прамфінплян і калі ёсьць прарывы, дык трэба выкрыць **прычыны** прарываў, як партыйныя і прафесыянальна-гаспадарчыя арганізацыі **кіруюць ліквідацыяй** прарываў, як фабрычныя арганізацыі **кіруюць** сапспаборніцтвам і ўдарніцтвам, як **выконваюцца прапановы рабочых** і як фабрыкі і заводы **рыхтуюцца да 3-га году пяцігодкі.**

У Беларусі наглядаецца нячуваны ўдым бядняцка-серадняцкіх мас вёскі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Ад правільнага скарыстаньня гэтага ўздыму залежаць посьпехі **калгаснага будаўніцтва.** Рабселькоры павінны асьвятліць, як на мясцох практычна ажыцьцяўляецца далейшае ўцягненьне бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы, якую дапамогу аказвае сацыялістычны сэктар індывідуальнаму, якая праводзіцца растлумачальная работа аб значэньні калгаснага будаўніцтва, як працуюць хаты-чытальні ў гэтай галіне, які адпор атрымліваюць кулацкія вылазкі і контр-рэвалюцыйная агітацыя супроць калгаснага будаўніцтва, як сацыялістычны і індывідуальны сэктары рыхтуюцца да асенняй пасеўнай сэзоны і **як раённыя і сельскія арганізацыі на справе кіруюць рэканструкцыяй сельска-гаспадаркі.**

Рабселькоры ў сваіх допісах павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на тое, **як нашы арганізацыі змагаюцца за генэральную лінію партыі,** як яны змагаюцца з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе рэвалюцыі, рэцыдывамі трацкізму і «левымі» загібамі.

Ва ўмовах нацыянальнага нераплёту, які ёсьць у Беларусі, **правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня адыгрывае вялізарнейшую ролю.** Рабселькоры ў сваіх допісах павінны паказаць, як на мясцох вырашаецца нацыянальнае пытаньне, як партыйныя арганізацыі ў штодзённай рабоце змагаюцца з ухілам ад лініі партыі ў нацыянальні, правымі беларускага нацыянал-дэмакратызму, расійскага вялікадзяржаўнага і інш. шавінізмаў і як праводзіцца **беларусізацыя** ў нашых установах.

У Беларусі, дзе ёсьць вялікая колькасьць яўрэйскай местачковай беднаты, рабселькоры ў сваіх допісах павінны асьвятліць, як партыйныя арганізацыі на мясцох праводзяць работу на прыцягненьні да вытворчай працы, у першую чаргу беднаты, якая мае выбарчыя правы, як праходзіць уцягненьне гэтай беднаты ў калгасы, саматужныя арцелі, дзяржаўную і мясцовую прамысловасьць і г. д.

16 партыйны зьезд у сваёй пастанове зьвярнуў асаблівую ўвагу на пастаноўку ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыю няпісьменнасьці і фарсаваньне **падрыхтоўкі кадраў.** У апошні час партыйнымі і савецкімі арганізацыямі Беларусі ўхвалены рад пастаноў у гэтай галіне. У сваіх допісах рабселькоры павінны асьвятліць, **як на мясцох ідзе выкананьне гэтых важнейшых прапаноў,** як мабілізавана грамадзкасьць вакол усеагульнага навучаньня, як разгорнута сапспаборніцтва, шэфства прадпрыемстваў над школамі і г. д.

У апошні час друк сыгналізаваў аб недахопах **у рабоце з выпучэнцамі.** Рабселькорам патрэбна зьвярнуць асаблівую ўвагу на асьвятленьне, як праходзіць выпучэньне і арабачэньне нашага апарату, выразнымі прыкладамі паказаць, у **якіх умовах працуюць выпучэнцы і як партыйныя ячэйкі дапамагаюць ім у рабоце.**

У сувязі з ліквідацыяй акруг, трэба асьвятліць, **як узмацняюцца раёны,** як вышэйшыя арганізацыі павярнуліся **тварам да раёну** і як перабудаваді сваю работу раённыя арганізацыі.

Рэдакцыя газэты **«Зьвязда»** спадзяецца, што рабселькоры ўлічаць усю палітычную важнасьць праверкі і будуць актыўна ўдзельнічаць у агляднзе работы КП(б)Б.

Масавы сэктар газ. «ЗЬВЯЗДА».

Вынікі бязьдзейнасьці

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Дырэктыва акруговага камітэту аб скаканьні рэалізацыі пазыкі да 15-га жніўня ня выканана. На 20-га жніўня рэалізавана па Магілеўскай акрузе 54,9 проц. кантрольнага заданьня. У горадзе сярод рабочых і служачых падпіска дасягнула 68 проц. кантрольнай лічбы.

Асабліва дрэнна ідзе рэалізацыя па цагельнях №№ 1, 2 і 7 — ад 30 да 40%, на «Госмоздоре» — 8 проц., на 6-м будаўнічым участку 30 проц., на заводзе «Адраджэньне» — 62 проц., групкоме саюзу будаўнікоў № 1 — 26 проц. Партыйныя ячэйкі, фабзаўкомы і камісіі садзейнасьці гэтых прадпрыемстваў недаацанілі важнасьці кампаніі, не мабілізавалі рабочых вакол падпіскі.

Дасканалыя вынікі дала падпіска на цукерні—110 проц., у прафшколе абутнікаў — 121 проц., у саюзе сувязі — 134 проц.

Кантрольнае заданьне па падпісцы сярод псаргарізаванага насельніцтва і саматужнікаў выканана толькі на 53 проц.

Асабліва дрэнна праходзіць падпіска сярод сялян. На радзе раённаў яшчэ нічога ня зроблена. На **Кармянскім раёне** да 20-га жніўня сярод адзінаасобных гаспадарак і калгасьнікаў рэалізавана пазыкі на 260 руб. У Чырвонапольскім раёне сярод калгасьнікаў рэалізавана пазыкі на 260 руб., сярод адзінаасобнікаў — ні на адзін рубель. У Бялыніцкім раёне не рэалізавана ні адной аблігацыі ні сярод адзінаасобнікаў, ні сярод калгасьнікаў. Добры прыклад падае толькі Магілеўскі раён, дзе рэалізавана сярод калгасьнікаў — 8.400 рублёў, сярод адзінаасобнікаў за наяўны разьлік — 10.800 руб.

Сельсаветы, раёвыканкомы, парт'ячэйкі па месцох ня кіруюць работай па рэалізацыі. У Шклоўскім раёне ні ў адным калгасе няма камісіі садзейнасьці. Такі-ж малюнак і ў Бялыніцкім раёне.

А. С.

Пазыка „Пяцігодка—за чатыры гады“

НЕ ЗДАВАЦЬ ПАЗЫЦЫЙ У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЯЦІГОДКУ!

ПАЗЫКА ДРЭННА ПАШЫРАЕЦЦА ТАМ,— дзе спадзяюцца на самацёк, дзе не разгорнута сапспаборніцтва, дзе не працуюць камісіі садзейнасьці.

Лічбы гавораць за сябе

„Сапспабор І-тва парушае прынцып дабраахвотнасьці“ —лічыць фінінспэктар Яйман

СУРАЖ. (Ад брыгады). Брыгада газ. «Зьвязда» і Наркамфіну БССР абсьледавала ход рэалізацыі пазыкі на Сураскім раёне, б. Віцебскай акругі.

Тая зводка, якую пасьля доўгіх пошукаў знайшоў старшыня раённай камісіі садзейнасьці ў ашчадной касе, ясна гаворыць аб тым, што ніхто дагэтуль сур'ёзна не займаўся справай рэалізацыі пазыкі. Паводле кантрольнага заданьня, сярод рабочых і служачых трэба было рэалізаваць 35.000 рублёў, а рэалізавана 19.000, што складае каля 55 проц. кантрольных лічбаў.

Аб ходзе рэалізацыі пазыкі на вёсцы раённая камісія садзейнасьці мае весткі толькі на 3-х сельсаветах. Паводле гэтых вестак, рэалізавана пазыкі на суму 6[illegible] рублёў, а кантрольнае заданьне на вёсцы — 25 тысяч рублёў. Лічбы гавораць самі за сябе.

Кампанія рэалізацыі пазыкі ў Сураскім раёне правальваецца з-за бязьдзейнасьці і няўважлівых адносін мясцовых арганізацый. Раёвыканком толькі 21-га жніўня упяршыню заслухаў па прэзыдыуме РВК справаздачу раённай камісіі. Праверка работы па рэалізацыі не праводзілася, Камісія садзейнасьці не арганізавала кіраўніцтва рэалізацыяй пазыкі.

Работнікі сураскага банку па-бюракратычнаму падышлі да падпіскі. Калі 12-га жніўня былі атрыманы першыя аблігацыі новай пазыкі на 3.500 рублёў для продажу за наяўны разрахунак, дык работнікі банку не паклапаціліся паслаць гэтыя аблігацыі на вёску. Яны пратрымалі іх у сябе да 23-га жніўня і парэшце раздалі раённым установам. Работнік фондавага аддзелу Дзяржбанку Трахімчык, прымацаваны да Янаві

Усебеларуская выстаўка

НАПЕРАКОР СТЫХІІ

(У павільёне агнятрывалага будаўніцтва)

— «Павільён агнятрывалага будаўніцтва, а асабліва, агнятрывалыя будынкі, захапіў мяне сваімі экспанатамі».

— «Пры вялікай патрэбе ў лесаматар'ялах для пабудовы фабрык і заводаў, жылых памяшканьняў, будовы з гліны, саломы і гальля павінны быць вядомы ўсім.

ніпа, варштаты, дыяграмы, фота-здымкі.

Гліна, салома, парканныя дручкі, хвоя, шлак, — няўжо ўсё гэта ідзе на карысьць, на будаваньне прасторных дамоў?

Растлумачальныя табліцы на кутох

ПАВІЛЬЁНЫ АГНЯТРЫВАЛАГА БУДАЎНІЦТВА НА ВЫСТАЎЦЫ

— «У павільёне паказаны шляхі далейшага разьвіцьця агнятрывалага будаўніцтва. Кожны экскурсант павінен пабачыць гэты цікавы кусток».

Гэта запіс, пакінуты калгасьнікам Мацільскім у кнізе ўражаньняў экскурсантаў.

І сапраўды. Нязграбныя экспанаты (цэгла, чарапіца, а галоўным чынам — розныя сыстэмы кладкі сьцен) усе ж ставяць перад нашымі калгасамі праблему агнятрывалага будаўніцтва.

Прымітыўныя будаўнічыя матар'ялы даўным - даўно знайшлі сабе прыстасаваньне за межамі. Саламіт у Бэльгіі і Францыі, гліна і гальлё — у Польшчы, часткова — у Нямеччыне, усюды, дзе лясы адступаюць пад націскам гораду, узводзяцца партацыўныя, лёгкія і агнятрывалыя будынкі.

Мэтавай устаноўкай гэтага павільёну было: паказаць перавагу агнятрывалаасьці і навучыць будаваць з танных матар'ялаў жыльлё, пуні, сьвіраны.

За апошнія тры гады Савецкі Саюз панёс страт ад пажараў звыш, як на 384 мільёны руб. На 165-170 міл. руб. у год гарыць толькі рознае маемасьці па вёсках.

І вось найлепшым сродкам змаганьня з «чырвоным пеўнем» зьяўляецца агнятрывалае будаўніцтва.

У гэтым, чамусьці закінутым, ня ведама куды, павільёне прадстаўлены ўзоры агнятрывалых сьцен: саламіт, кладка цэглы з эканоміяй да 50-60% пры захаваньні ўсёй цяплыні пармальнае кладкі, каркасная, саманная і гліна - гальлёвая.

Уласна кажучы, памянёныя ўзоры знаходзяцца пад спэцыяльнымі паветкамі некалькі воддаль. У самым-жа павільёне — узоры бэтонных каменьняў, дойлідная і пясчана - цамэнтная чара-

экспанатаў - мадэляў сьцьвярджаюць, што ня толькі ідзе, але і абыходзіцца значна таней і дае вялікія выгады.

Адзін кубамэтр саламітавае сьцяны каштуе 2 руб. 15 кап. — амаль у два разы таней, чымся той-жа кубамэтр звычайнае, драўлянае сьцяны. А саламіт — гэта саламяныя шчыты, укладзеныя пры дапамозе надта простага прэсу. Відавочна, што ў вясковых умовах рабіць яго зусім лёгка. Саламіт не праводзіць ні цяпла, ні гуку і дзякуючы моцнай спрасаванасьці — не гарыць.

Вось прыклады эканомнае кладкі цагляных сьцен — у адну, у дзьве цагліны. Паміж цаглін — хваёвыя шышкі, драўляныя адкіды, вугальле. Адзін кубамэтр звычайнага муру каштуе 9 руб. 84 кап., а пры такой кладцы ўсяго 5 руб. 25 кап. Эфэкт-жа аднолькавы.

Вось пабудовы з гліны і гальля. Яны робяцца ў СССР у Разанскай, Тульскай, Ленінградзкай, Пскоўскай, Тамбоўскай акругах. За 5-10 дзён з гэтага матар'ялу можна пабудаваць хату, і яна будзе доўгавечная, танная і цёплая. Ва ўмовах Беларусі, дзе шмат гліны, гэты від агнятрывалага будаўніцтва набывае асабліваe значэньне.

Самы павільён пабудаваны менавіта з гліна - гальлёвага матар'ялу.

Ёсьць і спэцыяльная літаратура па агнятрывалым будаўніцтве. Толькі яна выстаўлена ў вітрыне. Чаму Наркамзему ня ўтварыць там для экскурсантаў продаж гэтых танных кніжок?

Сёньня калгасы ставяць перад сабою задачаю пабудову новых жыльлёвых памяшканьняў, скотных двароў. У той-жа час мы ставім перад неабходнасьцю берагчы лясныя багацьці краіны. Адгэтуль зразумела, што арганізаванае наведваньне гэтага павільёну, знаёмства калгасьнікаў з яго экспанатамі, адыгрывае ў агульнай сыстэме наведваньня выстаўкі далёка не апошнюю ролю.

Між тым, з прычыны далёкае адлегласьці ад цэнтру ён наведваецца дрэнна. Групаводы абмінаюць гэты павільён і экскурсанты ідуць туды самацёкам.

Павільён наогул мала папулярызаваны на самой тэрыторыі выстаўкі.

Юр. Л—ны.

Юрка Лявонны

НА ТЭМУ ДНЯ

Стань, мой верш,
як асілак-камбайн,
Тэму гнуткую разам выжні.
Чырванее штандараў май,
Дзе спрадвеку хіліўся здрыжнік.

Чыстай раніцай вокам кінь
На прагон
Вакзал-Камароўка:
Закінаюць трамваяў званкі
На галоўнейшых астаноўках.

А за Менскам
дзе ў багне зялёнай
Балявалі калісь туманы—
На паверку ўстаюць павільёны,
Як фантазіі зьдзейсьненай сны.

Працягнуліся ў жнівеньскіх росах
(І запал перакажаш каму?)
Сталінбуда нэрвовыя тросы,
Ўзоры фабрык,
саўгасаў,
камун...

Можна славіць машынную медзь,
Але ў стократ—
імпэт чалавечы,
Што прымусіў краіну гарэць
Нязвычайным спаборніцтвам рэчаў.

І таму
што мы сонечна-горды,
Што рашуча зьмяняем зямлю,
Выплываюць сягоньня акорды
На абшар павільёнаў і клюмб.

Бачыў я:
на тых самых загонах,
Дзе завеі аркестрылі гру,
Адарваўся бяз крыўд і праклёнаў
Векавечнай традыцыі груз.

Ён, старэча,
прышоў «індывалам»
Ад саломы худога двара.
А сягоньня — якою навалай
У брывёх закрынічыла рань?

Кажа так:
«не ўяўляў а ніколі
Так цудоўна расьцьвіўшых акрас...
Знаю зараз,
дзе стрэнем мы долю,—
Ўсёй сям'ёю на заўтра—
ў калгас!».

І расьце, і хвалюецца жар—
Шыр у сэрца нязлічаным зьлыдням!—
Быццам гэта — вялізны пляцдарм
Новых боек
за ўдарныя тыдні.

Дзень уступіць вячэрняй сяўбе,
Вось даўжэюць за плошчаю цені.
На вясёлы трамвайны бег
З пастамэнту ўзірае Ленін.

24—VIII—30.

Павільён рыбаводзтва

Хроніка выстаўкі

— Заўчора ўвечары на ўсебеларускую выстаўку прыбыў з Масквы камбайн «Камунар» № 45.

— 31 жніўня пасьля 2-дзённага агляду выстаўкі рэдакцыю «Сацыялістычнае Рэканструкцыі» наведаў прадстаўнік дацкага міністэрства зямляробства, дарадца пасольства Даніі ў СССР п. **Кофад.** У рэдакцыі ён пакінуў ліст, дзе піша аб сваім вялікім уражаньні ад экспанатаў.

МЕНСК

Месячнік вывазкі лесу

Поўнасьцю выканаць заданьне

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР т. Бэнэк разаслаў тэлеграму ўсім райвыканкомам:

— За 25 дзён месячніка—гаворыцца ў тэлеграме—выканана толькі 24 проц. заданьня. Такое становішча пагражае забесьпячэньню гарадоў апалам. Месячнік працягнуты да 15 верасьня, таму прапануецца ўжыць рашучыя меры да поўнага выкананьня заданьня.

Вывезена толькі 23,7 проц. дроў

Паводле вестак Лесбелу, на 25 жніўня заданьне па вывазцы дроў выканана ў разьмерах 23,7 проц. Найбольш адсталі Барысаўскі, Вуаьдзенскі, Полацкі, Глускі леспрамгасы, якія ня выканалі нават і 10 проц. заданьня.

Вельмі панольна ідзе вывазка па Бабруйскім, Гомельскім, Віцебскім і Чэрвеньскім раёнах.

Лепш за ўсё праходзіць вывазка па Мазырскім раёне, які выкапаў 50 проц. заданьня. На другім месцы ідзе Магілеўскі леспрамсаюз—37 проц.

З Полацкага раёну паведамляюць, што, у зьвязку са слабым кіраўніцтвам райвыканкому, месячнік зрываецца.

Райвыканкомы Віцебскага лесраёну ня прымаюць рашучых мер для выкананьня заданьня.

З Барысаўскага лесраёну скардзяцца на недахват прамтавараў і слабую дапамогу спажывецкіх таварыстваў.

У Бабруйскім лесраёне не праведзена адпаведная растлумачальная работы, у зьвязку з чым сяляне адмаўляюцца прымаць нарады. Член Заборскага сельсавету, Асіповіцкага раёну Адзінец агітаваў сярод сялян—ня браць нарадаў на возку дроў.

Па Бацэвіцкім лесраёне вывазка лесаматар'ялаў—на мёртвым пункце. Вывезена толькі 1.500 куб. мэтраў. Кліччаўскі райвыканком, апрача пасылкі дырэктыў аб месячніку, нічога не зрабіў.

На нарадзе пры РВК некаторыя старшыні сельсаветаў выказваліся супроць месячніка. Ніякай растлумачальнай работы не праведзена. У выніку гэтага, некаторыя сяляне знайшлі магчымым адмовіцца ад прыняцьця павестак—«гэта, моў, не павіннасьць».

У Менску арганізуюцца закрытыя разьмеркавальнікі

Ліст праўленьня МЦРК

28 жніўня прэзыдыум праўленьня МЦРК абгаварыў пытаньне адносна разьмеркавацеляй. Былі праведзены паляраднія сходы на заводах: «Энэргія», «Кастрычнік», чыгуначных майстэрнях і інш.

Прэзыдыум выказаўся за хутчэйшую арганізацыю закрытых разьмеркавацеляй, як найлепшую форму клясавага разьмеркаваньня тавараў.

Рабочыя на прадпрыемствах цалкам ухваляюць арганізацыю закрытых разьмеркавацеляй.

У сувязі з арганізацыяй закрытых разьмеркавацеляй паўстаюць наступныя пытаньні:

— Як найлепш іх арганізаваць—па вытворчым ці па тэрытарыяльным прынцыпах.

— Ці павінны гэтыя магазыны ахапіць толькі харчовыя, ці таксама іншыя тавары шырокага спажываньня.

— Як лепш арганізаваць рабочы кантроль над закрытымі разьмеркавацелямі?

Лічачы гэта пытаньне надзвычай актуальным, праўленьне зварачаецца да ўсіх рабочых—пайшчыкаў, каапактыву, прафэсыянальных і каапэрацыйных работнікаў з просьбай выказацца па сутнасьці закранутых пытаньняў.

Праўленьне МЦРК.

Электрыфікацыя прадпрыемстваў

Усесаюзны Электрычны Сындыкат прыступае да электра - абсталяваньня леса-камбінату «Камінтэрн» (Нова-Бацэвіч саў), Гомсельмашу (Гомель), Экстрактнага заводу «Дубіцель» (Рэчыца), папяровай ф-кі «Спартак» (Шклоў) і інш.

Прыезд амэрыканскай дэлегацыі

Учора ў Менск прыехала дэлегацыя амэрыканскага таварыства «ІКОР» (садзейнасьці зямляўпарадкаваньню яўрэяў). У склад дэлегацыі уваходзяць п. п. Эпштэйн, Левін, Франк, Зыльбэрман, і Сэгаль. Дэлегацыя прабудзе ў Менску некалькі дзён і азнаёміцца з будаўніцтвам і культурай БССР.

ЗА ДЗЕНЬ

— Праз месяц у Менску адкрываецца другая амбуляторыя па Маскоўскай вуліцы.

— Усесаюзны электрычны сындыкат скончыў мантаж электра-абсталяваньня клінічнага гарадку ў Менску.

— Для павышэньня кваліфікацыі электра-манцёраў арганізаваны курсы на 70 чалавек.

— Бедбюро чыгуначнікаў адкрывае 6-тыдзённыя курсы для нізавога прафактыву.

— ЦСПСБ пастанавіў перавесьці ЦП саюзу тэкстыльшчыкаў з Віцебску ў Менск.

Адсталы вучастак дабрабыту

Клюбы, сталоўкі, рынкі—у антысанітарным становішчы

Здаецца, нашы дзяржаўныя, грамадзкія ўстановы павінны былі паказаць прыклад узорнага санітарна-гігіенічнага становішча, прыклад дасканалай чыстаты.

Між тым, санітарнае становішча большасьці ўстаноў вельмі дрэннае. Возьмем, напрыклад, **клюбы.** Большая частка іх ня толькі ў раёнах, але і ў Менску ўтрымліваецца брудна. Падлогі мыюцца рэдка, шмат пылу, прыбіральні брудныя, за імі ніхто ня сочыць.

У абедзеных залях рабочых сталовак таксама брудна. Амаль ва ўсіх няма разьдзявальняў. Ніхто ня сочыць за тым, каб наведвальнікі зьнімалі верхнюю вопратку, галёшы і не забруджвалі абедзенай залі. Грамадзкія сталоўкі, якія павінны перабудоўваць быт на новых пачатках, нашыраць санітарныя навыкі,—самі ў адносінах гігіены стаяць далёка не на вышыні. У Барысаве і Койданаве ў мінулым годзе пабудаваны вельмі добрыя сталоўкі, але аб пабудове разьдзявальняў пры іх ніхто не паклапаціўся.

Каб кожны наведвальнік мог памыць рукі, сталоўкі павінны мець ручнікі, па меншай меры, адзін на 25-50 чал., але ў большасьці нашых сталовак, якія абслугоўваюць 1000-2000 чал. штодзенна, вісяць 1-2 рушнікі.

У асабліва антысанітарным становішчы знаходзяцца рынкі і грамадзкія прыбіральні г. Менску. Ачыстка рынкаў расьцягваецца на 1-2 дні, замест таго, каб ачысьціць іх зараз-жа пасьля сканчэньня гандлю на працягу 1-2 гадзін. Гной ня ўбіраецца да таго часу, пакуль за ім ня прыедуць з бліжэйшага калгасу ці вёскі.

Для ўкараненьня санітарных навыкаў, мы павінны не на словах, а на справе зьвярнуць увагу на пытаньне санітарнай культуры. Кожная ўстанова павінна прадугледзіць у сваім каштарысе сродкі на санітарна-гігіенічныя мерапрыемствы.

Санітарны доктар РАХОЎСКІ.



Пабудова унівэрсытэцкага гарадка

З лістоў рабселькораў

ПРАПАНОВА ЎРАДАВАЙ КАМІСІІ НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА

Урадавая камісія запрапанавала **Белкаапсаюзу і Паляводсаюзу** тэрмінова дагаварыцца аб скарыстаньні **Белкаапсаюзам** складзкой плошчы, якая ёсьць у вялікай колькасьці, для хаваньня збожжа новага ўраджаю.

У выкананьні гэтай пастановы пакуль што нічога ня зроблена. **Бюракраты з Белкаапсаюзу,** мабыць, зусім забыліся, што хлебазагатоўкі ўжо пачаліся і размаўляць няма часу. Цэлы месяц ляжыць бяз руху выпіска з пратаколу **Урадавай камісіі.** Невядома, калі яе выкананьць нашы «спэцы» з **Белкаапсаюзу і Паляводсаюзу.**

За такія тэмпы ў хлебазагатоўках і падрыхтоўцы да яе,—трэба прыцягнуць да адказнасьці. Пастанова **Ўрадавай камісіі** павінна быць неадкладна зажыцьцёўлена.

Н. Г.

БУДУЮЦЬ І ЛАМАЮЦЬ

У Магілеве, паводле бюджэту на **1929-30** г., было прадугледжана пабудаваць **агульна-гарадзкую пральню.** За пабудову ўзяліся сваячасова, але бяз ньвёрдага праекту. На гэту пабудову ўкладзе на 65 тыс. руб., але да гэтага часу пабудова яшчэ ня скончана. Зараз патрабуецца вялікая папраўка, бо праектам ня была прадугледжана пабудова сушні. **Машыннае аддзяленьне два** разы перараблялася і толькі зараз спахваціліся, што трэба зрабіць дадатковыя чарцяжы. **Гарадзкі камгас** рашучых мер да зьніччэньня недахопаў на пабудове ня прымае. Трэба каму належыць, умяшацца і прыцягнуць вінаватых да **адказнасьці.**

«Т».

СІЛАСАВАНЬНЕ

У Нараўлянскім раёне (Мазыр...) работа па сіласаваньні сарвана. **Рагассаюз** склікаў курсы па сіласа... на тры дні. На гэтыя курсы мер... ся прыняць звыш 30 курсантаў, а... лася 6 асоб, а якімі правялі трэ... ную гутарку. Вось на гэтым і скан... ся работа **райкалгассаюзу.** Яшчэ... позна. Трэба ўзяцца за работу.

Брыг...

КАЛІ-Ж ВЦРК ЗАДАВОЛІЦЬ ПРОСЬБУ ПАЙШЧЫКАЎ?

Пайшчыкі **Віцебскага ЦРК,** які... вуць на ўкраінах гораду, ... хаданнічалі перад **Віцебскім ЦР...** адчыненьні на **Працалюбівай вул.** ... дуктовага магазыну. Аб гэтым ... ўжо рад пастаноў пайшчыкаў і ... зе новаму праўленьню ЦРК. Пр... ее **Віцебскага** ЦРК упарта ня ... гэтай пастановы пайшчыкаў. І ... той час, калі адчыненьне магазы... **Працалюбівай вул.** роч неабход... рабочым і пайшчыкам ускраін ... прыходзіцца хадзіць за прадук... магазыны, якія знаходзяцца на ... ласьці двух і болей клм.

Калі-ж ЦРК здаволіць просьбы ... пчыкаў?

12 подп...

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ У САЎ...

У саўгасе **«Некрашы»,** Слуцкага ... пу, — усе сельска - гаспадарчыя ... ны, як дзіскавыя бораны, плугі, ... жыноўкі, жнівяркі і г. д. раскіну... двары пад адкрытым небам. Павес... хаваньня прылад маецца, але ... страцыя саўгасу чамусь-ці лічы... патрэбным заняць павень машы...

Д. Ложэ...

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Сад Асьветы. 2-га верасьня 1930 г.— кіно «Пачатак кар'еры». Пач., а 9 гадз. 30 хв. У выпадку дрэннага надвор'я—пераносіцца ў памяшканьне Дому Асьветы.

Дом Асьветы закупіў на 9 верасьня 1930 г. для членаў саюзу працасьветы спэктакль балету дзяржаўнай маскоўскай студыі імя Айсэдоры Дункан у садзе «Прафінтэрн». **Білеты** штодзенна ў **канцылярыі** Дому з 11 да 2 і з 6 да 10 гадз.

БДУ. 2 верасьня, а 6 гадз. увеч. адбудзецца агульна-студэнцкі сход факультэту савецкага будаўніцтва і права ў памяшканьні галоўнага корпусу (3-ці паверх). Яўка студэнтаў абавязкова.

Прафком.

— 4-га верасьня роўна а 6 гадз. увеч. у **прыродазнаўчым корпусе аўдыторыя № 1** адбудзецца агульны сход студэнтаў пэдфаку. Яўка абавязкова.

Прафком.

Вячэрні рабочы унівэрсытэт. Прыём заяў для паступленьня ў менскі вячэрні рабочы ўнівэрсытэт працягну... 10 верасьня г. г. Прыём заяў і ... розных даведак—штодзенна ў ... ры ВРУ (Зямляробскі зав., № 4) ... зычным інстытуце БДУ.

Дом Камасьветы. 2-га верасьня ... гадз., пак. № 19 **групавая кансу...** ... **для** дакладчыкаў аб МЮД... стрычніцкага і Фрунзаўскага ... ЖКСМБ.

— А 7 гадз. **групавая кансуль...** для транспартных ячэек аб стано... транспарту і надрыхтоўцы да ас... зімовых перавозак.

З 4 да 8 верасьня г. г. у **памяшк...** **Белдзяржвыдавецтва,** (пак. № 14) ... дзецца перарэгістрацыя перакла... стыльрэдактараў і карэктараў, які... цавалі да гэтага часу для БДВ.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІ...

15-га верасьня ў г. Менску адкрываецца

1-шы Усебеларускі зьезд па палітэхнічнай асьвеце...

ПАРАДАК ДНЯ.

1. Рэканструкцыя нар. гаспадаркі і палітэхнічнае выхаваньне.
2. Формы і мэтады працы палітэхнічнай школы.
3. Роля ФЗС у падрыхтоўцы кадраў.
4. Падрыхтоўка масавых калгасных кадраў і ЦКМ.
5. Палітэхнізацыя школы і роля ў ёй прафсаюзаў.
6. Сэкцыі па праграмаўцы праграм.

Старшыня арг. камітэту, Наркамасьветы БССР **А. ПЛАТУН.**

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Сёньня, 2 верасьня

„АВАНГАРД" п'еса ў 4-х дзеях. **В. Катаеў.**

Пастаноўка С. Разанава і К. Саньнікава. Мастак Ю. Гольц. Музыка В. Сакалова. Дырыжэр І. Гіттарц. Кіраўнік хору М. Кауфман. Паказ рэжысэр С. Калпашнікаў.

Пачатак роўна а 8 з пал. гадз. | Білеты прадаюцца ў касе тэатру, у рабочай касе і на Усебеларускай выстаўцы.

Мастацкі **ЦЫРК** | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

СЁНЬНЯ, 2 верасьня

УДАРНАЕ ЗРЭЛІШЧА

ВЯЛІКАЕ ПРАДСТАЎЛЕНЬНЕ ў 3-х адзд. 14 лепш. №№

ГАСТРОЛІ

лепшых ролікабежцаў **З БРЭНДЗІ** | лепшых бытавых сатырыкаў **2 КАНВАЛЬДЗІ**

І ЎВЕСЬ СКЛАД ТРУПЫ | гладыятары **З МІРАЛЬДО** | І ЎВЕСЬ СКЛАД ТРУПЫ

— Пачатак а 8 з пал. гадз. веч. —

Білеты прадаюцца ў рабочых тэатральных касах, на с.-г. выстаўцы, у Доме Саюзаў і ў касе цырку з **12 г.** да **2 г. дня** і з **5** да **10 з пал. гадз. вечара.**

Канферансье **Е. А. Яўгеноў.**

Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

Кіно-тэатр **„Культура"** | З прычыны вялікага посьпеху яшчэ 3 дні З 1 верасьня **ЗЭЛІМ ХАН** Драма ў 6 частках. Пач. сэансаў: а 7 г., 8 г. 40 м., 10 г. 20 м. Каса адкрытаад 5 гадз.

КІНО **Інтэрнацыянал** | МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **ПАВАРОТ** Драма ў 6 частках. **Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.**

КІНО **„Пралетары"** | 2-гі — тыдзень — 2-гі Нямецкі мастацкі фільм **Начны крык** Драма ў 7 частках. Пач. 1 сэансу а 7 г. Каса адчын. ад 5 г.

ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр **„ЮНЫ ПІЯНЭР"** | **НОВАЯ КАРЦІНА** **Сапраўдныя паляўнічыя** Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз. дня, 2-га—а 3 гадз. 30 м. **Каса адкрыта з 12 гадз. дня.**

КІНО-САД

АД АЎТОРКА, 2 ВЕРАСЬНЯ

ВЭРНЭР КРАУС, ЖЭНІ ЮГО

У КАРЦІНЕ

ЖОНКА СТАТС-САКРАТАРА

ТОЛЬКІ 2 СЭАНСЫ:

ПАЧАТАК 1-га сэансу а **9 гадз.**
2-га сэансу а **10 гадз. 30 м.**

Кіно **„СПАРТАК"** | **З пакядзелка, 1 верасьня** НЯМЕЦКІ БАЯВІК **ВАРЭТЭ** драма 7 частках. У гал. ролях: ЭМІЛЬ ЯНІНГС і ЛІЛА дэ-Пуці. Пачатак сэансаў: **7 г., 9 г., 11 г.** КАСА—ад **6 гадз.**

ПАТРАБУЕЦЦА **ПАКОВАЧНАЕ ЖАЛЕЗА.** Зварачацца да заг. гаспад. друкарні газэты «ЗЬВЯЗДА», Савецкая, 63.

Галоўнае кіраўніцтва шосавых і грунтавых дарог і аўтатранспарту БССР

абвяшчае, што б. у ведамы НКАсьветы БССР

Магілеўская школа дзесятнікаў і дар. майстроў

РЭАРГАНІЗАВАНА

Ў дарожна-будаўнічы тэхнікум.

Прыём на агульных падставах, згодна даведніку НКАсьветы БССР. Частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам. Заявы прымаюцца да 10 верасьня ў канцылярыі тэхнікуму ў г. МАГІЛЕВЕ, ЛЕНІНСКАЯ, № 43.

Гаўдэртрамо БССР.

Мяняю кватэру з 2-х пакояў і кухні 11 кв. саж. у цэнтры на кватэру з 2-3 пакояў 8-10 кв. саж. у цэнтры або каля цэнтру. Звяніць 7-94,—2, 3, 4 верасьня ад 4 да 5 гадз. дня.

КСНХ **СЕВКАВУКРПРОМСТРОЙ** ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ **строительных десятников** РОСТОВ-ДОН. Сенная, 24 П Проспект высылается по первому требованию

ШКОЛА МАЛОДШАГА ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ ст. КАЛІНКАВІЧЫ

На базе сямігодкі з 2-гадовымтэрмінам навучаньня прымае да 15 **верасьня** ў наступныя аддзяленьні:

1) Эксплёатацыйнае —80 ч. 1 курс
2) Цягавае —80 ч. 1 курс
3) Пупейскае —40 ч. 1 курс
4) Электра-мажавічнае-сувязі—18 на II курс з 9 гр. адпаведнага ўхілу.

Правілы прыёму і ўмовы жыцьцёвага забесьпячэньня тыя-ж, што і ў тэхнікумах. Заявы з усімі дакумантамі накіроўваць па адрасе: ст. **Калінкавічы,** Зах. чыг., школа малодшага тэхнічнага персаналу.

Нач. школы **Ласевіч.**

Для здачы **АБВЕСТКІ** ў газэту **„ЗЬВЯЗДА"** звяніце па тэл. **7-81**

БЕЛАРУСКІ РАДЫЁ-ЦЭНТР

ГЭТЫМ ПАВЕДАМЛЯЕ,

што ва ўсіх раённых цэнтрах БССР устаноўлены РАДЫЁ-ПРЫЁМНІКІ для прыёму распараджэньняў і дырэктыў ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР, ЦСПСБ, наркаматаў, прафсаюзаў і іншых дырэктыўных органаў і арганізацый.

Распараджэньні будуць перадавацца праз Менскую Радыё-Станцыю штодзенна ад 13 да 15 гадзін, пачынаючы з 5-га верасьня г. г.

Усе ўстановы адбіткі распараджэньняў, якія яны будуць перадаваць праз радыё, абавязкова дасылаюць поштай паказаным ў распараджэньні адрасатам.

ПЕРАДАДЗЕНЫЯ РАДЫЁГРАМЫ Ў ДРУГІ РАЗ ПЕРАДАВАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.

Перадача радыёграм будзе адбывацца за плату, якая ўносіцца пры падачы радыёграмы або ўстановы ўносяць аванс.

Кошт слова ўстанаўліваецца, згодна наступнай табліцы з множеньнем на колькасьць пунктаў, а менавіта:

Да 5 пунктаў	—	7 кап. за слова	
Ад 6 да 10 пунктаў	—	6 »	» »
» 11 » 25 »	—	5 »	» »
» 26 » 40 »	—	4 »	» »
» 41 » 60 »	—	3 »	» »
» 61 » 100 »	—	2 »	» »
Звыш 100 пункт.	—	1 »	» »

ПРЫКЛАД: Радыёграма 50 слоў для 100 раёнаў будзе каштаваць 50.2.100=100 руб., або звыш 100 пункт.: 50.1.100=50 руб. Радыёграмы прымаюцца напісаныя на машынны з поўным паказаньнем адрасату і назвы ўстановы. Радыёграма павінна быць напісана ў самым сьціслым выглядзе (бяз лішніх слоў) і абавязкова на беларускай мове.

У радыёцэнтр радыёграмы павінны паступаць не пазней 11 гадз

Нам. упоўнаважанага НКПІТ МАСЭВІЧ

Заг. радыёвяшчаньнем БРЦ НАЎМЁНАК

БЕЛАРУСКІ РАДЫЁ-УНІВЭРСЫТЭТ

У АДКАЗ НА ШМАТЛІКІЯ ЗАПЫТАНЬНІ таварышоў, што жадаюць паступіць у Беларускі рабоча-сялянскі унівэрсытэт па радыё,

ПАВЕДАМЛЯЕ:

1. Радыё-унівэрсытэт зьяўляецца **завочнай навучальнай установай,** гэта значыць, што кожны слухач будзе **вучыцца дома.** Лекцыі на ўсіх факультэтах будуць чытацца па радыё, апрача таго, кожны студэнт атрымае матар'ялы і заданьне для праграмкі ўсяго курсу факультэту.
2. Унівэрсытэт ніякіх стыпэндый не дае.
3. Ва унівэрсытэт прымаюцца таварышы ва ўзросьце ад 18 да 45 год, якія маюць веды за 4-годку і больш.

РАДЫ�ё-УНІВЭРСЫТЭТ.

ЦП саюзаў швэйнікаў, гарбароў і саўгандальслужа...

СКЛІКАЮЦЬ

шырокую

ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ

па пытаньні якасьці прадукцыі і абслугоўваньня рабочага спажыўца.

Канферэнцыя адбудзецца 3 верасьня а 6 гадз. веч. у клюбе ... кароў (Ленінская, 13).

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклады дырэктароў швэйнай фабрыкі «Кастрычн... абутковай ф-кі аб якасьці прадукцыі.
2. Садаклады рабочых брыгад і бракераў.

На канферэнцыю павінны зьявіцца рабочыя ф-кі «Кастрычн... абутковай ф-кі, а таксама прадаўнікі абутковых ... аддзеньня магазынаў.

Запрашаюцца прадстаўнікі НК РСІ, НКГ, БКС, ЦСПСБ, ... вытворч. саюзаў, каапактыў, рабочыя спажыўцы і прадс... рэдакцый газэт.

ЦП саюзаў швэйнікаў, гарбароў, саўгандальслужачых

ЦП саюзу саўгандальслужачых паведамляе, што

працяг канфэрэнцыі працаўнікоў крэдытных устаноў

па пытаньні аб рэарганізацыі крэдытнай сыстэмы,

у сувязі з ліквідацыяй акруг, адбудзецца **4 верасьня** ... а 8 гадз. веч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужа... Яўка дэлегатаў канфэрэнцыі, актыву крэдытных устаноў ... прадстаўнікоў зацікаўленых устаноў і арганізацый абавя... кова без спазьненьня.

РЭДАКЦЫЯ ЧАСОПІСІ **«Беларуская Работніца і Сялянка»** **перамясьцілася** з памяшкан. ЦК КП(б)Б (вул. Карла Маркса, 2) у памяшканьне Акругкому КП(б)Б, **ВУЛ. ЭНГЕЛЬСА,** 2 **пакой № 14, 15, тэлефон № 5-85.**

ПАТРАБУЮЦЦА дві бухгальтар...

Знаёмыя з вытворчасьцю, пажадана з лесазагатоўкамі. ... тацца па адрасе: м-ка **Глуск Леспрамгас.**

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакуманту

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Менск. Галоўлітбел 30...